

ЦІ ВАРТА КУПЛЯЦЬ ПАТРЫМАНЫЯ РЭЧЫ? 4

АЛЬФОНСЫ І ІХ «РАБОТА» Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 104 (28971)


## ЛІЧБА ДНЯ

**130 тысяч**

*білетаў прададзена на сёння на ІІ Еўрапейскія гульні. З агульнай колькасці балельшчыкаў, якія маюць намер наведаць спаборніцтвы, госці з-за мяжы складаюць 10—15 %. Найбольш актыўныя пакупнікі — расіяне, але, як адзначаюць у дырэкцыі Гульняў, чакаюцца госці з Блізкага Усходу, Азіі, Паўночнай Амерыкі, Афрыкі і Аўстраліі. Купіць білеты на ІІ Еўрапейскія гульні можна на сайце minsk2019.ticketpro.by, у сетцы партнёрскіх кас білетнага апаратара на тэрыторыі Беларусі і ў больш чым 300 пунктах продажу па ўсёй краіне — ва ўсіх абласных гарадах і буйных раённых цэнтрах. Дырэкцыя таксама падрыхтавала спецыяльны відэаролік, у якім падрабязна расказваецца, як стаць уладальнікам білетаў на розныя спаборніцтвы — пакупнік патраціць мінімум часу.*

# РАМОНКАВЫ ЎКОС





Фота БелТА.

Так, вы не памыліліся: кіроўца Антон ШМУКСТА падкідае ў такой вялізнай колькасці сапраўды рамонкі! У сельгаспрадпрыемстве «Саўгас «Вялікае Мажэйкава» Шчучынскага раёна, якое спецыялізуецца на вырошчванні лекавых траў, сёлета плануюць сабраць каля 300 тон белых кветак.

## КОРАТКА

- **Беларускія ВНУ павялічваюць колькасць бюджэтных месцаў на медспецыяльнасці.**
- Страхавыя кампаніі будуць аплачваць рамонт аўто пасля ДТЗ без уліку зносу некаторых дэталяў.
- **У Мінскім раёне канфіскавалі больш за 1750 л кантрафактнага машыннага алею.**
- У Брэсце на бульвары Касманаўтаў на ўчастку ад вуліцы Пушкінскай да вуліцы Арджанікідзэ, а таксама на пуцеправодзе па вуліцы Маскоўскай (Кобрынскім мосце) выдзеляць спецыяльныя палосы для руху грамадскага транспарту.
- **Новы сезон Вялікага тэатра Беларусі адкрые прэм'ера оперы «Князь Ігар».**
- Найбуйнейшая сметніца ў Індыі ў 2020 годзе стане вышэй за Тадж-Махал.

Камунальныя стасункі

# ПЫЛАСОС ДЛЯ ПАД'ЕЗДА

### У Заводскім раёне сталіцы камунальнікі праводзяць эксперымент па чысціні

**Мыць і падмятаць пад'езды з дапамогай пыласосаў у жыллёва-эксплуатацыйным участку № 4 Заводскага раёна г. Мінска пачалі з 1 сакавіка. Першыя паверхі жылых дамоў на тэрыторыі, якая абслугоўваецца ЖЭУ, замятаюць штодня, а раз на месяц пыласосяць і мыюць увесь пад'езд. Такі падыход зрабіў месцы агульнага карыстання чысцейшымі, зарплата рабочых у спецыяльна сфарміраваных для гэтага брыгадах узрасла на 40 %, а кошт гэтай паслугі для жыхароў застаўся ў межах гранічна дапушчальнага тарыфу на яе ў 65 капеек, канстатуюць спецыялісты галіны.**



СТАР. 4

Фестывальны Віцебск запрашае!



# НАВІНКІ «БАЗАРНАГА» ЛЕТА

**Да пачатку XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» засталося каля месяца. Першыя мерапрыемствы пройдуць 8 ліпеня, афіцыйнае адкрыццё — 11 ліпеня. Арганізатары штогод стараюцца прыдумваць новыя цікавінкі. І часта бывае, што новае — гэта добра забытае старое. Але калі гэта ў новым фармаце з нестандартным падыходам — успрымаецца вельмі добра.**

### «Базар» без меж

Сёлета ў дырэкцыі «базару» новы кіраўнік — 31-гадовы Глеб Лапіцкі, чалавек творчы, крэатыўны, амбіцыйны. У арганізацыйных пытаннях не пачатковец. Па адукацыі рэжысёр масавых свят. Курыраваў праект «7 таямніц Беларусі», «Новыя імёны Беларусі», міжнародны форум «Тэмп»...

Калі «Звяздзе», першай з рэдакцый газет, даваў летась інтэрв'ю, паабяцаў, што на фэсце ў 2019 годзе будуць сюрпрызы для сямейнага прагляду. І яны ўжо ёсць па-за «базарам». Набірае абароты новы творчы праект «Віцебскі кваРТал» —- бясплатныя вулічныя канцэрты. Яны праводзяцца каля канцэртнай залы «Віцебск», калі даждлівае надвор'е, гледачоў бясплатна запрашаюць пад дах гэтага палаца.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!

# МЕСЦА ДЛЯ МІРНАГА ДЫЯЛОГУ

### Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Леанідам Кучмам

**Нагадаем, што ў пачатку чэрвеня 2019 года ён зноў быў прызначаны прадстаўніком Украіны ў трохбаковай кантактнай групе.**

Беларускі лідар выказаў задавальненне, што Леанід Кучма зноў прыехаў у Мінск у гэтай якасці. Таксама Аляксандр Лукашэнка спыніўся на развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння паміж краінамі. Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што летась толькі афіцыйна зарэгістраваны тавараабарот — а гэта аснова адносін — склаў 5,5 мільярда долараў.

Выключна даверны характар адносін паміж Беларуссю і Украінай у цэлым быў падкрэслены на сустрэчы. «Што датычыцца палітыкі, яна не змянілася. Вы ведаеце мае падыходы, ведаеце падыходы беларусаў па адносінах да Украіны і ўкраінцаў», — адзначыў Прэзідэнт, дадаўшы, што дзеля сустрэчы з Леанідам Кучмам перанёс запланаваную камандзіроўку.

На сустрэчы Леанід Кучма адзначыў, што роля і месца Мінска як перагаворнай пляцоўкі ў рабоце трохбаковай кантактнай групы мае каласальнае значэнне.

«Вы, напэўна, добра ведаеце, што раздаваліся многія галасы, што трэба некуды перанесці. Гэта абсалютны абсурд, які не мае пад сабой ніякіх падстаў. Мінск абраны, гэта адзінае месца, дзе можна праводзіць нармальны дыялог. А з улікам таго, як ставіцца ўлада Беларусі да гэтых працэсаў, дык удвая», — сказаў украінскі палітык.

Прадстаўнік Украіны ў трохбаковай кантактнай групе ўпэўнены: гісторыя і заўтрашні дзень кажуць пра неабходнасць сумеснага вырашэння тых праблем, якія цяпер ёсць у яго краіне. І тут разлічвалі на дапамогу Беларусі і персанальна яе кіраўніка.

«Для мяне асабіста заўсёды радасць быць у Мінску, у вашай цудоўнай краіне, сустракаца з Прэзідэнтам, да якога я стаўлюся з вялікай павагай», — адзначыў Леанід Кучма.

**Паводле БелТА.**

# Масты для міру і стабільнасці

## Ці гатова Беларусь стаць другой Швейцарыяй?

**Наколькі значная для нашай краіны пазіцыя нейтралітэту ў сучасных канфліктах, разважалі ўдзельнікі міжнароднай канферэнцыі «Беларусь у сучасных геапалітычных і геаэканамічных працэсах», якая адбылася ўчора ў Нацыянальнай акадэміі навук. Эксперты прыехалі ў Мінск з Расіі, Польшчы, Бельгіі, Германіі і Венгрыі.**

Эксперты абмяркоўвалі, якім чынам Беларусь рэалізуе стратэгію ад in between да bridging, — ад пазіцыі памежнай краіны да дзяржавы-моста, якая дапамагае наладжваць камунікацыю Захаду і Усходу.

Пазіцыю Міністэрства замежных спраў (МЗС) на канферэнцыі прадставіў **начальнік упраўлення знешнепалітычнага аналізу Сяргей МАЛІНОЎСКІ.** Адносна тэматыкі дыскусіі дыпламат заўважыў: «Мост — гэта статычная канструкцыя, якая мае значную станоўчую функцыю, яднаць бакі, але не дапускае ніякай актыўнасці. Гэта не тая пазіцыя, якую хацела б займаць наша краіна. Беларусь дзейнічае дастаткова актыўна ў якасці суверэннай дзяржавы на міжнароднай арэне».

Пацверджанне таму — старшынства Беларусі ў Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятыве, правядзенне Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску і шэраг іншых міжнародных сустрэч на высокім узроўні, якія адбыліся за апошнія пару год.

«Дасягненне Мінскіх пагадненняў па Украіне ў значнай меры перавярнула імідж нашай краіны. Сёння Мінск у медыйнай прасторы і ў грамадскім меркаванні асацыюецца менавіта з гэтымі пагадненнямі», — сказаў Сяргей Маліноўскі.

Па словах прадстаўніка МЗС, краіна працягвае генераваць ідэі для так званага «аб'яднальнага міжнароднага парадку». Такой ініцыятывай з'яўляецца «інтэграцыя інтэграцый». «Сёння можна казаць пра больш мяккія фармулёўкі — партнёрства інтэграцый, кааперацыя інтэграцый. Гэта ўсё накіравана на тое, каб пераадолець палітычныя, эканамічныя, ваенна-палітычныя межы, бар'еры, — адзначыў дыпламат. — Але гэта агульная тэндэнцыя. Не толькі Беларусь прасоўвае такія прапановы».

Наша дзяржава — актыўны ўдзельнік усіх інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы, які сумленна выконвае свае абавязкі. Патэнцыял звязваць еўрапейскую і еўразійскую прасторы Беларусь бачыць і ў ініцыятыве «Усходняга партнёрства».

«Балансаванне паміж Расіяй і Еўрапейскім саюзам мне здаецца не зусім карэктнай пастаноўкай пытання. Было б правільна казаць аб знаходжанні балансу інтарэсаў Беларусі ў адносінах з нашымі партнёрамі, — паведаміў Сяргей Маліноўскі. — Таму што, на мой погляд, Беларусь не балансуе, а дакладна прытрымліваецца сваіх абавязкаў у рамках інтэграцыйных аб'яднанняў».

**Марыя ДАДАЛКА.**

Вытворчы юбілей

# Штадлер Мінск — пяць гадоў

У гэтую суботу беларуска-швейцарскі вытворца рухомага саставу «Штадлер Мінск», рэзідэнт СЭЗ «Мінск», адчыніць свае дзверы для ўсіх, хто жадае пазнаёміцца з прадпрыемствам і асаблівасцямі вытворчасці чыгуначнага транспарту. Рэч у тым, што роўна пяць гадоў таму сучасная кампанія пачала сваю дзейнасць, запусціўшы вытворчасць першага двухпавярховага цягніка KISS для расійскага аператара «Аэраэкспрэс».

У дзень адчыненых дзвярэй — 8 чэрвеня — наведвальнікі змогуць азнаёміцца з усімі стадыямі вытворчасці цягнікоў і трамваяў. Госці транспартнай кампаніі змогуць наведаць зварачныя і фарбавальныя цэхі, зборачны цэх і цэх запуску, а таксама задаць пытанні спецыялістам кампаніі. Падчас туру будуць паказаныя першыя цягнікі для трэцяй лініі мінскага метро, легендарныя двухпавярховыя цягнікі KISS для Венгрыі і Азербайджана, аднапавярховыя цягнікі-бестселеры FLIRT для Нарвегіі, самыя доўгія трохсекцыйныя трамваі для Балівіі і многае іншае.

Гасцей у гэты дзень у Фаніпалі чакаюць забаўляльная музычная і спартыўная праграмы, розныя конкурсы і віктарыны, зоны актывацыі і фотазоны. Кампанія запрашае ўсіх ахвотных.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Прыёмная кампанія — 2019

# КОЛЬКІ ПРЭТЭНДЭНТАЎ НА СТУДЭНЦКІ БІЛЕТ?

**1 чэрвеня ў краіне завяршылася рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. Усяго для здачы тэстаў зарэгістравалася амаль 77 тысяч чалавек. Яны будуць здаваць 258,3 тысячы тэстаў.**

Традыцыйна найбольшая колькасць пропускаў была афармлена для здачы тэста па рускай мове — амаль 63 тысячы. Ёсць абітурыенты, якія будуць здаваць і рускую, і беларускую мовы, каб потым выбраць сертыфікат па дзяржаўнай мове з больш высокім балам. Права здаваць чатыры тэсты ёсць ва ўсіх, і калі абітурыент ужо дакладна вызначыўся з профілем будучай спецыяльнасці, то для падстрахоўкі некаторыя здаюць дзве дзяржаўныя мовы.

Нагадаем, што летась на тэсціраванне зарэгістраваўся 82 471 абітурыент (у 2017 годзе — 92 274). Такім чынам, колькасць прэтэндэнтаў на студэнцкі білет працягвае змяншацца, як, між іншым, і колькасць выпускнікоў 11 класаў. Наўрад ці хтосьці з абітурыентаў пажадае скарыстацца леташнімі сертыфікатамі ЦТ, бо сёлета будзе прымяняцца новая сістэма падліку балаў (хоць тэрмін дзеяння сертыфікатаў па-ранейшаму складае два гады і ніжнія парогі на ЦТ не змяніліся).

На тэст па матэматыцы зарэгістравалася больш за 42 тысячы чалавек, па фізіцы — каля 25 тысяч.

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў Беларусі 11 чэрвеня, і па традыцыі першымі ў пункты здачы ЦТ прыйдуць абітурыенты, якія пажадалі здаваць экзамен па роднай мове. Рускую мову абітурыенты будуць здаваць 13 чэрвеня.

Прадугледжаны для здачы тэстаў таксама і тры рэзервовыя дні (6, 8 і 10 ліпеня), але арганізатары ЦТ папярэджваюць: да здачы тэставых іспытаў у рэзервовы дзень будуць дапушчаны толькі тыя абітурыенты, якія змогуць даказаць, што ў іх былі сур'ёзныя прычыны для пропуску экзамену, напрыклад, прад'явіць даведку пра сваю хваробу ці дакумент, які пацвярджае іх удзел у гэты момант у важных для краіны спартыўных ці творчых спаборніцтвах. Пры гэтым абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць рэгістрацыі на ЦТ ва ўстаноўленыя тэрміны — гэта значыць да 1 чэрвеня гэтага года. Калі абітурыент у маі знаходзіўся за мяжой і не мог асабіста зарэгістравацца на ЦТ, за яго гэта маглі зрабіць законныя прадстаўнікі або прадстаўнікі абітурыента на падставе заверанай натарыяльна даверанасці.

Усяго ў 2019/2020 навучальным годзе беларускія ВНУ плануюць прыняць 54,7 тысячы першакурснікаў. На бюджэтныя месцы ў ВНУ змогуць прэтэндаваць 26,6 тысячы абітурыентаў — на 0,7 % больш, чым летась. Колькасць бюджэтнікаў дзённай формы навучання павялічыцца на медыцынскіх, IT-спецыяльнасцях, а таксама на спецыяльнасцях, звязаных з фізічнай культурай і спортам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Празе 120 тысяч дэманстрантаў патрабавалі адстаўкі прэм'ера

Некалькі дзясяткаў тысяч чалавек выйшлі на акцыю пратэсту ў Празе з патрабаваннем адстаўкі прэм'ер-міністра краіны Андрэя Бабіша, якога падазраюць у канфлікце інтарэсаў, паведамляе Reuters.

Паводле ацэнкі арганізатараў, на Вацлаўскай плошчы сабраліся 120 тысяч чалавек. Гэтая акцыя пратэсту стала адной з самых буйных у Празе з 1989 года, калі падчас "аксамітнай рэвалюцыі" пратэставалі сотні тысяч чалавек. Пратэсты супраць прэм'ер-міністра і мільярдэра Андрэя Бабіша ўзмацніліся ў канцы красавіка пасля таго, як чэшская паліцыя заявіла, што палітык павінен паўстаць перад судом па справе аб махлярстве.

Справа ў дачыненні да Бабіша звязана з размеркаваннем двух мільёнаў еўра субсідый Еўрасаюза, якія атрымалі кампаніі, звязаныя з прэм'ер-міністрам. Бабіш адмаўляе абвінавачванні, называючы справу палітычна матываванай.

### Зяленскі прапануе ўкраінскім бізнесменам інвеставаць у Данбас



Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі прапануе ўкраінскаму буйному бізнесу інвеставаць у інфраструктуру Данбаса. У інтэрв'ю тэлеканалу «1+1» Зяленскі паведаміў, што ўжо сустракаўся з шэрагам прадстаўнікоў буйнога бізнесу, у прыватнасці з Віктарам Пінчуком.

«Я па чарзе сустракаюся з усімі прадстаўнікамі буйнога бізнесу, — сказаў Зяленскі. — Іх не так шмат. Пінчук прыязджаў, і яго прыезд быў звязаны з Леанідам Кучмам, таму што я вельмі прасіў Леаніда Данілавіча, каб ён быў кіраўніком кантактнай групы ад Украіны. Сёння, дарэчы, якраз будзе першая сустрэча пасля вялікага перапынку. Я трымаю кулакі, каб усё сапраўды прайшло добра».

Па словах прэзідэнта, асобная сустрэча з прадстаўнікамі бізнесу будзе яшчэ ў чэрвені. «І мы будзем гаварыць пра развіццё Данбаса, — растлумачыў ён. — У нас ёсць план, мы хочам прапанаваць бізнесу інвеставаць менавіта ў Данбас, інвеставаць у інфраструктуру Данбаса, мы ўпэўнены, што Данбас дакладна вернецца».

### Трамп расказаў пра не вельмі добрае паветра і ваду ў Кітаі, Індыі і Расіі



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп лічыць, што кліматычныя змены з'яўляюцца пытаннем сумеснай сусветнай адказнасці. Пры гэтым ён заявіў, што ў такіх краінах, як Кітай, Індыя і Расія не вельмі добрая якасць паветра і вады. Пра гэта палітык, які знаходзіцца з дзяржаўным візітам у Вялікабрытаніі, расказаў у інтэрв'ю тэлеканалу ITV. Яно было паказана ў сераду.

«У ЗША, згодна з рознай статыстыкай, адзін з найлепшых станаў навакольнага асяроддзя, і ён робіцца ўсё лепшым. Кітай, Індыя, Расія, многія іншыя краіны — у іх не вельмі добрае паветра і не вельмі добрая вада з пункту гледжання забруджвання, і калі вы паедзеце ў некаторыя гарады, вы нават не зможаце нармальна дыхаць», — сцвярджае ён.

«Ёсць велізарная розніца паміж Кітаем, ЗША і іншымі краінамі», — заўважыў Трамп, звярнуўшы ўвагу, што праблемы з забруджваннем у адным кутку свету ў канчатковым выніку адчуваюцца ў іншых частках свету. «Калі казаць пра адлегласці ў маштабах планеты, то яны паміж Кітаем і ЗША вельмі невялікія», — дадаў ён.

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает о снятии с торгов, назначенных на 02.07.2019, лота № 1. Земельный участок с кадастровым № 221280610601000207 площадью 0,1452 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, д. Подберезье, ул. Новоселов, 10. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63.
УНП 300594330

ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает, что сведения, опубликованные в газете «Звязда» 18.05.2019 о снятии имущества ОАО «Кожевник» с торгов, считать недействительными. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63.
УНП 300594330

Утерянное свидетельство о государственной регистрации ООО «ВестПоставка» считать недействительным.
УНП 190747245

Лета прыйшло!

# КУПАЛЬНЫ СЕЗОН АДКРЫТЫ

## Пляжы пастараліся зрабіць больш камфортнымі

**Пляжны сезон у Беларусі для многіх распачаўся яшчэ ў маі, з наступленнем цёплых дзён. Спякотнае надвор'е на гэтым тыдні прыцягне да месцаў адпачынку яшчэ больш людзей. Мінскія пляжы да летняга сезона гарадскія ўлады адрамантавалі і добраўпарадкавалі. Такая ж работа праведзена і па ўсёй краіне. Якія навінкі для наведвальнікаў рэкрэацыйных зон падрыхтаваны і што зробіць пляжы яшчэ больш утульнымі, расказалі камунальнікі, эпідэміёлагі і выратавальнікі.**



У Мінску 20 пляжаў на чатырох вадасховішчах — Заслаўскім, Цнянскім, Драздах і Крыніцы. Да летняга сезона ўсюды падсыпаны пясок уздоўж берагавой лініі, адрамантавана і пафарбавана мэбля, выкананы бягучы рамонт грунтавых пад'язных дарог, стаянак і кантэйнерных пляцовак.

Сёлета на пляжах Цнянскага вадасховішча з'явіліся тэнісныя сталы. Ракеткі і мячы для гульні можна ўзяць у арэнду.

— Два тыдні мы назіралі і зразумелі, што не памыліліся, — сталы карыстаюцца папулярнасцю ў адпачывальнікаў, — расказвае **дырэктар Мінскай лесапаркавай гаспадаркі Павел БАГДАНЧЫК.** — Летась упершыню ўстанавілі 160 лежакоў. Яны бясплатныя і карысталіся вялікім попытам. Таму вырашылі ўстанавіць яшчэ 70.

З'явіцца 11 дадатковых металічных альтанак (імі абсталёўваюць сталічныя пляжы апошнія тры-чатыры гады). На пляжы № 2 Цнянскага вадасховішча добраўпарадкаваны куток, яго ўпрыгожылі спецыяльнай «лясной» мэбляй і дзвюма драўлянымі альтанкамі. У хуткім часе на пляжах побач з альтанкамі з'явіцца дзевяць дадатковых мангалаў. Таксама ў сталічных зонах адпачынку ўстаноўлена шэсць адзінак дзіцячага гульнявога абсталявання, заменены кабінкі для пераапранання, набыты урны вялікай умяшчальнасці. З пачатку мая працуюць біятуалеты, іх абслугоўваюць двойчы на тыдзень.

— На пляжах размяшчаецца 68 кантэйнераў для раздзельнага збору смецця. Толькі ў маі мы вывезлі каля чатырох тон пластыку і каля 1,3 тоны шкла, — адзначае Павел Багданчык. — Для штодзённай уборкі прынялі ў штат восем прыбіральшчыкаў. Вываз смецця ажыццяўляецца штодзень пяццю машынамі. З наступленнем спякоты смецце будзе вывозіцца двойчы ў дзень.

Усяго ў краіне 533 пляжы, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 99, Віцебскай — 92, Гомельскай — 49, Гродзенскай — 43, Мінскай — 132, Магілёўскай — 98. На ўсіх да пачатку сезона праведзена работа па падсыпцы берагавой лініі, ачыстцы дна вадасховішчаў, выкананы рамонт і фарбаванне пляжнага абсталявання, усталяваны амаль 800 прыбіральняў.

Як адзначыла **галоўны спецыяліст аддзела выкарыстання і аховы водных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў Лілія БОДА,** асаблівая ўвага сёлета аддавалася абсталяванню месцаў масавага адпачынку аўтамабільнымі стаянкамі. Да сезона падрыхтавана 490 аўтастаянак, устаноўлена больш за 3,5 тысячы кантэйнераў і урнаў для збору адходаў. Спецыяліст падкрэсліла, што асноўным парушэннем прыродаахоўнага заканадаўства ў месцах адпачынку побач з вадасховішчамі з'яўляецца несанкцыянаваны заезд аўтамабіляў у прыбярэжную паласу. І нагадала, што стаянка машын не дапускаецца бліжэй, чым за 30 метраў ад берагавой лініі.

Традыцыйна сачыць за бяспекай адпачывальнікаў будуць ратавальнікі.

— Наша асноўная праблема — людзі ў стане алкагольнага ап'янення. Сярод тых, хто тоне, іх больш за палову, — кажа **начальнік вадалазна-выратавальнай службы Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Арцём ДЗЯДЗЕЎ.** — Яшчэ адна катэгорыя, якая патрабуе асаблівай увагі — дзеці, якія засталіся без нагляду.

З пачатку года толькі ў Мінску патанула сем чалавек, але ў зоне дзеяння выратавальных станцый патанулых не было.

Перад пачаткам сезона эпідэміёлагі абследавалі ўсе зоны масавага адпачынку: ацанілі іх санітарны стан і ўзялі пробы вады. Іх заўвагі своечасова выправілі. Падчас купальнага сезона з чэрвеня да жніўня адбор проб вады будзе выконваць штотыднёва. Яны будуць ацэньваць па санітарна-эпідэміялагічных, біялагічных і паразіталагічных паказчыках.

— Сёння нестандартных проб вады няма. Пры першых нестандартных пробах мы абмяжоўваем купанне дзяцей, пры другой і наступных — дзяцей і дарослых, — тлумачыць **загадчык аддзялення камунальнай гігіены Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр СПУРГЯШ.**

Звычайна забароны купацца з'яўляюцца, калі спякотнае надвор'е доўжыцца працяглы час.

— Пры высокай тэмпературы размнажаюцца бактэрыі і водарасці, пробы ў такі час пагаршаюцца. Не рэкамендуецца купацца і пасля моцных дажджоў, калі ў вадаёмы трапляе лiўневая вада.

**Алена КРАВЕЦ.**

Маладзечна! Фестывалім

# МУЗЫКА, ПАЭЗІЯ, МАЛАДЗЕЧНА...

**У 19-ы раз чакае гасцей і ўдзельнікаў Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна». Лейтматывам фэсту, які пройдзе 7—8 чэрвеня, стануць Год малой радзімы і 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а ў праграме знойдуць імпрэзы на свой густ аматары песні і паэзіі, музыкі і тэатру, жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.**

Яшчэ ў студзені ва ўсіх абласцях краіны прайшлі папярэднія адборы маладых выканаўцаў. На II і III туры нацыянальнага конкурсу беларускай эстраднай песні ў Маладзечне трапіць 21 з іх (па тры выканаўцы з кожнага рэгіёна і сталіцы), і ўжо ўвечары 7 чэрвеня стане вядома, каго прафесійнае журы палічыла вартым Гран-пры імя Уладзіміра Мулявіна, а каму прысудзіла першую і другую прэміі.

24 майстры прыгожага слова, вядомыя дзеячы культуры і мастацтва станучь удзельнікамі шэрагу літаратурных мерапрыемстваў: запісу культуралагічнай аўтарскай праграмы Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», работы паэтычнай пляцоўкі «Мой родны кут, як ты мне мілы» і музычна-паэтычнай гасцёўні «Пад небам Бацькаўшчыны роднай». У апошняй, дарэчы, прагучаць творы, якія трапяць у зборнік паэзіі і прозы «Мая Радзіма», што рыхтуецца да выдання ў Выдавецкім доме «Звязда».

Заўважнай падзеяй фестывалю абяцае стаць прэм'ера канцэрта «Песні вайны», падрыхтаванага заслужаным калектывам «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі» пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга. Гэтую маштабную і разам з тым вельмі асабістую, кранальную музычную праграму госці пачуюць і ўбачаць падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця «Маладзечна-2019» на сцэне гарадскога летняга амфітэатра.

У другі дзень фестывалю творчыя калектывы, якія ўваходзяць у склад Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра, дадуць канцэрт акадэмічнай музыкі, прысвечаны творчасці Яўгена Глебава, — у Маладзечанскай школе мастацтваў, і джазавай песні — на сцэне Чысцінскага сельскага дома культуры, дзе любяць і заўжды чакаюць высокае мастацтва.

Увагу тэатралаў арганізатары звяртаюць на дзве пастаноўкі: спектакль «Янка Купала: жыццё ў свеце маланак», які прадставіць Беларускі дзяржаўны музычны тэатр, і «Не пакідай мяне» Мінскага абласнога драмтэатра.

У стварэнне агульнага вялікага свята ўключыліся і музеі. Напрыклад, Мінскі абласны краязнаўчы музей запрашае наведаць выстаўку мастацкіх вырабаў «Гармонія шкла», якая прадставіць работы творчай дынастыі барысаўскіх мастакоў Пятра і Тацяны Арцёмавых (іх эксклюзіўныя творы, між іншым, упрыгожваюць інтэр'еры штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку). Нацыянальны гістарычны прадставіць экспазіцыю «Аб вайне і Перамозе», а пры падтрымцы музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў межах рэспубліканскай акцыі «Беларусь помніць» будзе працаваць выстаўка «Жаночы твар Перамогі», што ўключае партрэты жанчынфрантавікоў, гераінь вайны.

Не менш цікавымі абяцаюць стаць традыцыйны мастацкі пленэр і праект «Асоба эпохі», цэнтральнымі асобамі якога становяцца жанчыны-легенды (сёлета гэта будзе Надзея Мікуліч, якая раскажа пра сваё жыццё і творчасць), гала-канцэрт «Маладзічок» запальвае зоркі» з удзелам лаўрэатаў сёлетняга адкрытага конкурсу юных выканаўцаў эстраднай песні, конкурс па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве «Вытокі майстэрства» і першы Арт-фэст «ЛянОК», прысвечаны аднаму з сімвалаў нашай краіны — льну.

А яркую творчую кропку ў фестывалі паставіць юбілейная канцэртная праграма «Зорны карагод», якой адзначае ўласнае 60-годдзе Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста Валянціна Дудкевіча. Гэты канцэрт, дарэчы, можна будзе не толькі пагледзець, але і паслухаць, бо яго ўдзельнікамі стануць вядомыя айчынныя артысты, з якімі ў калектыву склалася творчая садружнасць: Ірына Дарафеева, Алена Ланская, Аляксандр Саладуха, Юлія Быкава, ансамбль «Песняры» і вакальны гурт «Чысты голас», выхаванцы Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна.

Анансуючы мерапрыемствы 19-га Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі, прафесар Міхаіл Фінберг заклікаў праяўляць больш увагі і падтрымліваць маладых выканаўцаў, імёны якіх штогод адкрывае конкурс у Маладзечне і якія ў будучым прадставяць нашу краіну, у тым ліку на міжнародным узроўні. «Трэба шанаваць сваю культуру самім, каб яе шанавалі іншыя. Асабіста я буду рабіць, колькі б'ецца маё сэрца, усё магчымае і немагчымае, каб беларускую музыку ведалі ў свеце», — падкрэсліў народны артыст Беларусі.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# «Санет» — новая кнігарня ў Слоніме

На Гродзеншчыне заўжды шанавалі кнігу. І праз яе распаўсюджванне ў кнігарнях, і праз бібліятэчную прапаганду. Была арганізавана ў свой час нават прыватная бібліятэка беларускай кнігі імя Янкі Купалы ў адной са слонімскіх вёсак. І ў нялпростыя 1920—1930-я гады, калі Заходняя Беларусь была пад палякамі, надзвычай шанавалі кнігу на беларускай мове. Вось і новая кнігарня «Белкнігі» ў Гродзенскай вобласці адкрываецца менавіта ў Слоніме. З 15 чэрвеня яна пачне працаваць у тэставым рэжыме. А прымеркавана падзея да Дня беларуская пісьменства, які сёлета пройдзе ў старажытным горадзе 1 верасня.

Мы, несумненна, разумеем, што горад Слонім займае асаблівае месца ў гісторыі нашай краіны, мае свае багатыя асветніцкія традыцыі, — расказвае **генеральны дырэктар «Белкнігі» Аляксандр ВАШКЕВІЧ.** — І таму мы паспрабавалі ў асартыменце адлюстраваць тэматыку, звязаную са Слонімам, пісьменнікамі — ураджэнцамі Слонімшчыны, увогуле Гродзеншчыны. Спадзяёмся, што тэставы рэжым работы кнігарні дапаможа наладзіць стасункі з патэнцыйнымі пакупнікамі, дапаможа зразумець іх запыты, зацікаўленасць.

Кнігарня «Санет» зусім невыпадкова пачынае работу ў тэставым рэжыме 15 чэрвеня. У гэты дзень на Гродзеншчыне, у Карэліцкім раёне, пройдзе адмысловы фестываль «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку». Старажытны замак прыме гасцей не толькі з Беларусі. Прыедуць пісьменнікі і з Украіны і Расіі, каб сустрэцца са сваімі зацікаўленымі чытачамі, каб падпісаць кнігі з аўтографамі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# МІНЧАНІН ВЫЙГРАЎ 15 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ У ПРАЕКЦЕ «БІТВА ТАЛЕНТАЎ»

**Мікіта Бялько з Мінска стаў пераможцам музычнага шоу «Бітва талентаў», якое ладзіць расійская Акадэмія папулярнай музыкі Ігара Крутога. Трэці сезон тэлевізійнага праекта ішоў у эфіры тэлеканала СТС Love.**


Фота з афіцыйнай старонкі праекта ў сацсетках.

У праекце ўдзельнічалі 60 вакалістаў ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў, якія прайшлі папярэдні адбор і ўключыліся ў тэлевізійны конкурс за галоўны прыз — 1 мільён расійскіх рублёў на далейшае прасоўванне. Адметнасць праекта «Бітва талентаў» у тым, што ўсіх удзельнікаў дзеляць на дзве каманды (так званыя Ордэн Вады і Ордэн Агню), прадстаўнікі якіх пад кіраўніцтвам вопытных артыстаў спаборнічаюць паміж сабой, пакуль не застануцца толькі два фіналісты. Акрамя таго, на кожным этапе канкурсантаў ацэньваюць не адно і тое ж прафесійнае журы, а розныя суддзі.

У музычным шоу прымалі ўдзел і іншыя юныя артысты з Беларусі, але да фіналу дайшоў толькі Мікіта Бялько, якога суддзі, у тым ліку папулярная расійская спявачка Валерыя, ухвалілі за прафесіяналізм і артыстычную пераканаўчасць. Свой выйгрыш у 1 мільён рублёў (у эквіваленце гэта больш як 15 тысяч долараў) выканаўца плануе выдаткаваць на вучобу.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Фінансавы выдатнік

# КАЛІ «ПА ТРЫ» ЛЕПШ, ЧЫМ «ПА ПЯЦЬ»,

## або Ці варта купляць патрыманыя рэчы

**У эпоху суцэльнага «сэканд-хэнду», калі нават зоркі эстрады не грэбуюць купіць сабе нешта, што было ва ўжыванні, простаму чалавеку з народу варта ўсё ж такі задумацца — ці купляць яму старыя рэчы? Ці ў нас з вамі так шмат грошай, каб марнаваць іх на тое, што ўжо далёка не «па пяць»?**

Ёсць тавары, якія паспяваюць паслужыць некальким індывідам, але становяцца ад гэтага нават лепшымі, а ёсць такія, што цалкам аддаюць сябе аднаму ўладальніку. Ёсць людзі, якія купляюць толькі новае, таму што яно «заўсёды лепшае», а ёсць тыя, хто шукае выгаду ў любой куплі і не адмовіцца ад ужыванага. Паспрабуем разабрацца, у якіх выпадках «паношанае» і сапраўды (на погляд аўтара гэтых радкоў) больш выгаднае, чым «свежае».

### НЕРУХОМАСЦЬ І АЎТАМАБІЛІ

У нашай мясцовасці, дзе зімы халодныя, дамы заўсёды было прынята будаваць «на вякі». Просты якасны драўляны дом стаяў ад 50 да 70 гадоў. Старыя дамы з чырвонай цэглы стаяць яшчэ і цяпер. Нават у сучасных «панэльках» закладваецца рэсурс прыкладна на 50 гадоў.

Сучасны шматкватэрны дом мае сваю спецыфіку. Па ўласным вопыце скажу: у першыя пяць гадоў ён становіцца толькі лепшым: канструкцыя дае ўсаджванне, знікаюць усе агрэхі будаўнікоў, уладкоўваецца тэрыторыя, вакол будуюцца супермаркеты, дзіцячыя садкі і яшчэ шмат чаго. Праз дзесяць гадоў ваш раён робіцца сапраўды «спальным».

Значна трацiць у якасці шматкватэрны дом пачынае гадоў праз 20—40 (усё залежыць ад будаўнікоў і матэрыялаў). Але і гэта яшчэ не прысуд, а толькі падстава для рамонту, замены труб, уцяплення сцен і іншага. Таму існуе рынак другаснага жылля, і ў доўгатэрміновай перспектыве ён будзе большы, чым рынак навабудоўляў.

Усё напісанае пра кватэры з невялікімі карэкціроўкамі справядліва для капітальных прыватных дамоў. Але нават часовыя індывідуальныя збудаванні звычайна не ідуць пад знос цалкам. Іх рамантуюць і дабудоўваюць, вядома, у тым выпадку, калі месца ліквіднае.

У лецішчаў і гаражоў свая гісторыя. Людзі позняга савецкага часу пабудавалі велізарную колькасць гаражоў і дач. Ладная доля гэтых будынкаў ужо не патрэбна ні ім самім, ні іх дзецям. Вынік — падзенне цэн у разы. Цяпер купіць гараж або дачу ў невялікім мястэчку (а часам і ў абласным цэнтры) можна ў 2-3 разы танней, чым будаваць. Агульная выснова — купляць нерухомасць, якая была ва ўжыванні, але не занадта старая, звычайна выгадней.

Калі шматкватэрны дом адзначыў дзесяць гадоў і можа лічыцца новым, то 10-гадовая машына альбо патрабуе павышанай увагі, альбо пераходзіць у катэгорыю «аўтамабільнага хламу». Нашы зімовыя дарогі пры актыўнай эксплуатацыі транспарту хутка раз'ядаюць соллю дно аўто. Ужо за тры гады большасць машын трацiць ад 25 % да 45 % першапачатковай цаны.

Як параўнаць выгаду набыцця новага ці старога аўтамабіля? Новую машыну выгадна купляць, калі за час эксплуатацыі яна прынясе першаму ўладальніку больш, чым страціць у цане. Прыклад — таксіст, які зарабляе за пяць гадоў язды на новай машыне больш, чым яна губляе ў кошце за гэтыя пяць гадоў. Сукупныя страты ад рамонту перавышаюць выгаду ад набыцця ўтрыманага аўто. Прыклад — той жа таксіст, які выдаткаваў бы на рамонт чвэрць рабочага часу, і ўсе іншыя прафесіі, дзе «час — грошы».

Патрыманы аўтамабіль выгадны, калі ім карыстаюцца параўнаўча мала. Аўтамабіль, які прастаяў у гаражы, давядзецца прадаваць прыкладна за тую ж цану, што і той, які ўвесь час працаваў. Ён не зношваецца, але проста «старэе». Таму купляць новую машыну для паездак на дачу відавочна нявыгадна.

### СПАРТЫЎНЫ ІНВЕНТАР, «ЮВЕЛІРКА»

Неаднастайная, але даволі дарагая катэгорыя тавараў. Сюды ўвойдуць і веласіпеды, і трэнажоры, і гіры. Большасць такіх тавараў мала губляюць у працэсе выкарыстання. Гіры, гантэлі, штангі практычна не зношваюцца, а вось прадаюцца яны часам па непрыдатным кошце.

Новая чыгунная гіра вагой 24 кілаграмы ацэньваецца ў 90—215 рублёў, такую ж старую гіру можна купіць па цане металалому пры самастойным вынасе — каля 8—10 рублёў, а часам і наогул атрымаць бясплатна.

У лік выгадных набыткаў заўсёды ўваходзяць патрыманыя ўпрыгажэнні з каштоўных камянёў і металаў, гісторыя набыцця якіх не выклікае сумненняў. Карыстаецца попытам якасны (без сколаў і расколін) посуд з золата, срэбра і фарфору. Не будзе ўдалым набыццё таннай біжутэрыі і серыйнага заводскага посуду: іх у патрыманым стане можна прадаць толькі вельмі танна.

### БЫТАВАЯ ТЭХНІКА

Для тэлефонаў, фотаапаратаў, ноўтбукаў і іншай нестацыянарнай тэхнікі можна лічыць правілам падзенне кошту на 50 % праз год іх выкарыстання.

Тут пакупніку трэба мець звышздольнасць умення знайсці рэч у выдатным стане, якая праслужыць яшчэ хоць бы два-тры гады. Тады арыфметыка на баку патрыманай рэчы. Яшчэ адна разумная падстава для набыцця такой тэхнікі — калі рэч патрэбная, але грошай на новую няма. Але калі кошт ужыванага тавару набліжаецца да цаны новага і няма гарантыі, што прылада не зламаецца праз два дні, то лепш пашукаць крэдыт або растэрміноўку на новую рэч.

### АБУТАК І АДЗЕННЕ

Тут важны момант — ступень зносу. Так, футры і скураныя курткі пры правільным выкарыстанні вельмі «цягавітыя». Іншая справа, калі выбіраеш рэчы на адзін раз. Найлепшы прыклад — вясельныя сукенкі, якія захоўваюць выгляд і якасць, бо яны патрэбны ўсяго на два-тры дні. Усе рэчы, зробленыя з тонкіх тканін, а таксама штодзённы абутак трацяць свае вартасці вельмі хутка. Вырашальным крытэрыем таксама будзе цана. Дасведчаныя пакупнікі кажуць, што старое адзенне і абутак лепш браць не даражэй за трэціну ад першапачатковай цаны новых.

Увесь працэс выбару, па сутнасці, складаецца з асабістай ацэнкі спалучэння цаны і якасці з улікам знешніх умоў і ўласнага густу. Вось і ўсё.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПЫЛАСОС ДЛЯ ПАД'ЕЗДА



### Менш часу — больш грошай

Калі высвятліцца, што новаўвядзенні працуюць дакладна і выгадна для насельніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў цэлым, то гэты вопыт будзе распаўсюджваць на ўсю краіну, лічыць **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

ЖЭУ № 4 — падрадчык па аказанні паслуг па санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый, які выйграў права на аказанне гэтай паслугі на электронных таргах.

Рабочыя тут падзелены на брыгады, за якімі замацаваны пэўныя аб'ёмы работ. Тры брыгады займаюцца дапаможнымі тэрыторыямі ў дамах і тры — прыдамавымі плошчамі. Праз змяненне перыядычнасці ўборкі на штодзённае падмятанне ўручную першых паверхаў, адну сухую ўборку пыласосам і адну вільготную раз на месяц усяго пад'езда колькасць рабочых паменшала з 17 да 12 чалавек (амаль на 30 %). Пры гэтым іх заробкі павялічыліся — 650 рублёў і больш замест 450.

— У параўнанні з ручной уборкай нормы часу работ з пыласосам знізіліся на 5—10 % у залежнасці ад колькасці паверхаў і абсталявання дома, а эканомія фонду рабочага часу такім чынам склала ў сярэднім 8,5 %, — заўважыла **Алена КАЛЯГА, намеснік дырэктара па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні жыллёвага фонду КУП «Жыллёвая камунальная гаспадарка Заводскага раёна г. Мінска».** — Жыхары пра новы прынцып уборкі ведаюць і ставяцца да яго спакойна. Колькасць зваротаў у службу 115 након бруду ў пад'ездах амаль знікла.

Прынцып работы ў брыгадзе наступны: адзін пыласосіць, двое мыюць, яшчэ два замятаюць першыя паверхі. Праўда, у залежнасці ад колькасці паверхаў састава ўборкі можа вар'іравацца.

Брыгада з пяці чалавек здольная поўнасцю прыбраць пяць-сем пад'ездаў за дзень, і гэта без уліку падмятання першых паверхаў ва ўсіх астатніх дамах. Камунальнікі рабілі спецыяльны хранаметраж часу, які выявіў, што за працоўны дзень рабочы можа падмесці першыя паверхі 50 пад'ездаў, калі не будзе адцягваць увагу на нешта іншае, акрамя работы.

— Калі мы амаль не з'яўляемся на некаторых дамах, значыць, жыхарам там трэба і не плаціць за паслугу санітарнага ўтрымання, — упэўнены **Генадзь ТРУБІЛА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** — Усё проста. Трэба прымусіць нашых людзей працаваць па сем гадзін і якасна, а то яны здзіўляюцца, чаму такая маленькая зарплата.

### Пыласос-рукзак на акумулятары

Працаваць з пыласосам раней за дзевяць гадзін раніцы не пачынаюць, каб не шумець. Для ўборкі купляюцца адпаведныя мыйныя сродкі, ёсць нават спецыяльная вадкасць для выдалення жвачкі. А майстар участка штодня кантралюе перыядычнасць і якасць работ.

— Пасля кожнай уборкі ва ўсім пад'ездзе жыхарам прапануюць падпісаць акт прыёмкі выкананых работ. Калі ёсць заўвагі, выдаецца прэтэнзія на ліквідацыю недахопаў. Калі не выкарыстоўваюцца перыядычнасць, змяншаюцца аб'ёмы работ для брыгады, — патлумачыла Алена Каляга. — Калі ёсць скаргі на няякасную ўборку ці выкананыя не ў поўным аб'ёме работы, і яны пацвярджаюцца, то робіцца пераразлік за аказанне гэтай паслугі.

Акты выкананых работ, падпісаныя жыхарамі, прадстаўляюцца заказчыку прадстаўнікамі ЖЭУ штомесяц не пазней за 5-е чысло. Рэальнасць справаздачы правяраецца шлях выбарачнага абзвону спажыўцоў, якія падпісаліся.

У ЖЭУ № 4 карыстаюцца трыма прамысловымі пыласосамі для вільготнай уборкі пад'ездаў і пыласосам для сухой уборкі. «Вільготная» прылада з лёгкасцю збірае вялікія аб'ёмы вадкасці, пылу і буйнога смецця, расказала Алена Каляга:

— У працэсе карыстання мы папрасілі вытворцу даўкамплектаваць пыласос дадатковым шлангам на 2,5 метра (базавы — 1,9 метра), каб можна было прапыласосіць лесвічныя пралёты ўверх, уніз і перанесці апарат на наступную пляцоўку.

Пыласос-рукзак на акумулятарах для сухой уборкі мацуецца з дапамогай шырокіх шлеек на спіне і поясам — на жываце. Рабочыя кажуць, што так зніжаецца нагрузка на пазваночнік і абсталяванне надзейна фіксуецца, таму пыласосіць з такім цудам на спіне няцяжка, ды і не трэба хваляваццца, што паб'ецца.

— Яго вырашана выкарыстоўваць на незадымляльных лесвіцах дамоў ад 12 паверхаў і вышэй, калі няма разетак. РУП «Інстытут «Белжылпраект» распрацаваў нам нормы часу на ўборку. Напрыклад, каб прапыласосіць 19 паверхаў, спатрэбіцца 3,5 гадзіны, — дадае спецыяліст. — У дамах вышыняй да 12 паверхаў у размеркавальных шчытках устаноўлены разеткі для падключэння пыласоса.

### Вокны мыюць раз на год, ліфты — раз на пяць дзён

— Крыніцай фінансавання ўборкі дапаможных памяшканняў — калідораў, лесвічных клетак, пляцовак, падвалаў, ліфтаў і іншых месцаў, якімі карыстаюцца ўсе жыхары дома, — з'яўляюцца сродкі насельніцтва або іншыя спосабы фінансавання, якія не адносяцца да бюджэту. Таму аказанне паслугі па санітарным утрыманні дапаможных тэрыторый набываецца на конкурсе праз аўкцыён згодна з заканадаўствам па закупках за кошт уласных сродкаў. Пры гэтым уласнікі могуць таксама самастойна выбраць, хто будзе прыбірацца ў іх пад'ездзе. Такім чынам, якасць уборкі кантралююць не толькі адміністрацыі раёнаў горада, цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, камунальнікі ды іншыя структуры, а і самі жыхары, — заўважыла **Валянціна БАРКОЎСКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».**

— Перыядычнасць работ па санітарным утрыманні, згодна з нормамі, павінна быць наступнай. Раз на пяць дзён ажыццяўляецца прыборка кабіны ліфта, не менш чым двойчы на тыдзень робіцца сухая ўборка ад смецця, два разы на месяц — мыйка і дэзінфекцыя лесвічнай пляцоўкі. Раз на год, у асноўным у маі, мыюцца вокны, раз на год абмятаецца пыл — тое, што называецца генеральная ўборка, — і праводзіцца дэратызацыя і дэзінсекцыя, — расказала спецыяліст. — Новая перыядычнасць, якую прапануе праект уборкі пад'ездаў з пыласосамі, дазволіла сканцэнтраваць намаганні на ўборцы першых паверхаў жылля і забяспечыць належную якасць. Аднак трэба памятаць, што перыядычнасць залежыць ад тых сродкаў, што фактычна паступаюць ад жыхароў.

Прымяненне пыласосаў паляпшае якасць уборкі, аднак разам з тым гэта не так танна — кошт электраэнергіі для яго работы — каля 570 рублёў у год.

Тут спецыяліст дарэчы звярнула ўвагу на вопыт Польшчы ў сферы ЖКГ, дзе ўборкай пад'ездаў у асноўным займаюцца самі жыхары згодна з пакватэрнымі графікамі, выкарыстоўваючы для мыцця ў тым ліку і пыласосы.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сямейная газета
Выпуск № 9 (124)

# НЕ Ў ДЫПЛОМЕ ШЧАСЦЕ

Скончыўся чарговы навучальны год, і ў бацькоўскіх чатах пачалося выхваляньне граматамі, дыпломамі і пахвальнымі лістамі, якія атрымалі нашы выдатнікі, спартсмены, таленты і наогул самыя лепшыя ў свеце школьнікі.

Многія дзеці таксама заразіліся гэтым духам спаборніцтва. Мая старэйшая дачка, натхнёная атрыманымі граматамі, доўга пазіравала з імі на бацькаву фотакамеру, а потым дапытвалася ў мяне, колькі «дзявятак» дапушчальна атрымаць за ўвесь час навучання ў школе, каб лічыцца выдатніцай, і вяла нейкія толькі ёй зразумелыя падлікі ў нататніку. Яе прыяцелька па гульнях, на пару гадоў старэйшая, літаральна плакала з-за таго, што ў гадавым табелі выйшла адна «васьмёрка». А калега, у якой сын сёлета скончыў 9 класаў на 9 і 10 балаў, прызналася, што разняволіцца толькі пасля апошняга экзамену, а пакуль яны абодва «на валяр'янцы»...

Я, канешне, ганаруся поспехам сваіх дзяцей — дый за чужых, калі на тое пайшло, умею парадавацца. Я толькі «за», калі яны цягнуцца да ведаў, праяўляюць сябе ў творчасці, у спорце, калі з цікавасцю займаюцца даследчай работай або ўдзельнічаюць у важных грамадскіх ініцыятывах. Але вельмі «супраць», калі працэс вучобы замест самаўдасканалення, развіцця асобы ператвараецца ў гонку за медалямі і дыпломамі, у калекцыянаванне пахвальных лістоў, каб мама/тата/бабуля ганарыліся і дырэктар на школьнай лінейцы адзначыў. Няхай будзе спартыўны азарт, дух спаборніцтва, інтэлектуальныя і творчыя пошукі — але не распачаты яшчэ ў дзяцінстве кірмаш пыхлівасці.

«Мама, — горача запярэчыла дачка, калі я сказала, што выдатныя адзнакі — не самае важнае ў жыцці, — але ж у цябе ёсць залаты медаль за школу! І я таксама хачу!» — «Што ты будзеш з ім далей рабіць, — смяюся, — саліць?»

...Не буду маніць, атрымліваць добрыя ацэнкі мне падабалася. Тым больш што пытаць, пісаць, лічыць — у першых класах гэта атрымлівалася лёгка. Далей вучыцца стала проста цікава, а потым неяк натуральна склалася прывычка і ўнутраная дысцыпліна — падрыхтавацца так, каб атрымаць не ніжэй за «чацвёрку» (яшчэ па той, пяцібальнай сістэме). Прытым ніякім вундэркіндам і дзяўчынкай з будучыняй я не была, таму даводзілася і папацець — на фізкультуры, дзе ніколі не любіла крос і наогул бег, ці на гісторыі, калі пэўныя даты імкнуліся вымыцца з памяці. Але сапраўдная «трагедыя» ў мяне здарылася з чарчэннем. Па ім — зараз прызнаюся ў жаху і ганьбе — некалькі чвэрцяў запар я атрымлівала «тройкі». Ватман не любіць выпраўленняў і пераробак, а інжынерных талентаў у мяне ніколі не было, таму здадзеныя скрэмзаныя і напаўсцёртыя неакуратныя чарцяжы ў розных праекцыях нагадвалі, як сказала б асляня Іа, сумнае відовішча. Настаўнік чарчэння, нядобра пасміхаючыся, казаў, што за такую знявагу яго прадмета не бачыць мне медаля як сваіх вушэй. З якім жа задавальненнем, даведаўшыся, што чарчэнне ў залік сярэдняй школы не ідзе, у дзень апошняга званка я кінула яму ў калідоры: «Можаце мяне павіншаваць, Н.Н-авіч!» Уласна, другі і апошні раз медаль даў мне ўпэўненасць у сваіх сілах пры паступленні ў інстытут: я проста не магла сабе дазволіць напісаць сачыненне дрэнна.

Але на кожнай сустрэчы выпускнікоў мы з былымі аднакласнікамі прыходзім да высновы, што не ў дыпломах і медалях шчасце. Адным гэта не спатрэбілася наогул, другім давялося звяртацца да рэпетытараў, каб падцягнуць намаляваныя адзнакі да рэальных ведаў. А моцныя прафесіяналы, паспяховыя бізнесмены, нарэшце, шчаслівыя людзі выраслі як з выдатнікаў, так і з самых што ні ёсць ціхіх троечнікаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

# МАЛЕНЬКІМІ НОЖКАМІ НА ВЯЛІКІЯ ПОДЫУМЫ



**Хлопчыкі-двайняты з беларускай сям'і працуюць у Кітаі і здымаюцца ў фільмах і серыялах беларускай і расійскай вытворчасці**

**Браты Яфім і Міхаіл ЦУБЫ з чатырох гадоў здымаюцца ў кіно, працуюць мадэлямі ў Італіі і Кітаі, рэкламуючы вядомыя брэнды дзіцячага адзення, прымаюць удзел у тыднях моды, пры гэтым не перарываючы навучання ў школе і займаючыся спортам. Пра тое, як хлопчыкі трапілі ў кіно і моду, як да гэтага ставіцца тата і чым давялося ахвяраваць дзеля іх заняткаў маме, сям'я Цубаў расказала ў сваім першым інтэрв'ю.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Нашы дзеці

# 64 ПРАБЛЕМЫ ШТОДНЯ

## Якім бы добрым ні быў дзіцячы дом, гэта ўсё роўна дзяржаўная ўстанова



**Сяргея маці кінула ў радзільні, збегла, і яе так і не знайшлі... Ваня і Максім — са шматдзетнай сям'і, у іх ёсць яшчэ два браты і дзве сястры, а маці вялікага сямейства, якой крыху за 25, нядаўна нарадзіла сёмае дзіця. Падобныя гісторыі, на жаль, зусім не выключэнне ў сталічным дзіцячым доме № 2. Напрыканцы лета яго расфарміруюць, бо дзесяць дзяцей выпусцяцца ў дарослае жыццё, нехта пойдзе на ўсынаўленне. Бацькоў дваіх малых адновяць у правах на дзяцей. Тым, хто застанецца, падбяруць іншыя формы выхавання, у прыватнасці, накіруюць у сямейныя дзіцячыя дамы, і гэта значна лепш, чым у дзетдоме, упэўнена яго дырэктар з больш як 30-гадовым стажам Валянціна ЗЯНЕВІЧ.**

### «РЭСТАРАННЫ» ЛАД ЖЫЦЦЯ

З мая 1988 года яна прыйшла сюды пасля змены трох дырэктараў, якія мяняліся ледзьве не штогод, і засталася на ўвесь час існавання ўстановы. Сёлета Валянціна Пятроўна адзначыла сваё 70-годдзе, аднак сіл і імпэту на гадаванцаў у дырэктара хопіць яшчэ на доўгія гады. Нездарма ж яна некалькі разоў бабуля, у тым ліку і праз былых выпускнікоў, якія і ў дарослым жыцці не забываюцца на тую, што імкнулася дапамагчы.

— У мяне пакуль пачуццё, што я ўсё жыццё тут буду працаваць, — смяецца яна. — Хоць сяброўкі і здзіўляюцца, як я столькі гадоў жыву на гэтым вулкане.

Прыходзячы на работу, дырэктар заўсёды пытаецца ў дзяжурнай: ці ўсе здаровыя, ці ўсе на месцы, ці ўсё добра? Так пачуццё адказнасці за падапечных станавілася пастаянным. Дырэктар дагэтуль не можа дазволіць сабе пайсці на бальнічны, у яе назбіралася ўжо 114 дзён адпачынку.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Жыхары дзіцячага дома заўжды стараюцца віншаваць тую, хто замяніў ім маці.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

## Што вы хацелі ведаць пра бясплатнае харчаванне для дзяцей да двух гадоў?

**Спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны расказваюць, ці мае права беспрацоўная жанчына на дапамогу па цяжарнасці і родах, а таксама ў якіх выпадках сям'я можа страціць права на бясплатныя прадукты харчавання для дзяцей да двух гадоў.**

***— Ці атрымаюць дапамогу па цяжарнасці і родах жанчыны, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных? І ў якім памеры яна прызначаецца?***

— Жанчыны, зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных, альбо калі яны праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і навучальныя курсы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, у адпаведнасці з арт. 7 закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, зарэгістраваным у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 % дапамогі па беспрацоўі за кожны каляндарны месяц перыяду, на які прызначана дапамога па цяжарнасці і родах, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і навучальныя курсы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 % стыпендыі за кожны каляндарны месяц перыяду, на які прызначана дапамога па цяжарнасці і родах, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

***— Якія прадукты харчавання выдаюцца бясплатна дзецям да двух гадоў?***

— Дзеці да двух гадоў забяспечваюцца бясплатна прадуктамі харчавання айчыннай вытворчасці, якія прызначаны для дзяцей ранняга ўзросту і маюць адпаведную маркіроўку на ўпакоўцы з указаннем узросту, з якога яны могуць ужывацца ў ежу.

Прадукты адпускаюцца ў межах нормы водпуску ва ўпакоўках таго аб'ёму, які маецца ў асартыменце.

Вы можаце самі выбраць сухую сумесь для дзіцячага харчавання. Але замена прадуктаў, прадугледжаных прыкладнымі наборамі, іншымі прадуктамі не дапускаецца. І ўлічыце: калі вы не атрымаеце прадукты на працягу месяца, права на іх атрыманне за гэты месяц страчваецца.

***— Калі муж з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, ці ёсць у сям'і права атрымліваць бясплатнае харчаванне на дзіця ва ўзросце да двух гадоў?***

— Асноўным крытэрыем для вызначэння права на забеспячэнне бясплатнымі прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця з'яўляецца бюджэт пражытковага мінімуму, які дзейнічае на дату падачы заявы. Калі ваш муж з'яўляецца прадпрымальнікам, яму неабходна падаць звесткі аб даходах ад занятку прадпрымальніцкай дзейнасцю за 12 месяцаў, якія папярэднічаюць месяцу звароту.

***— У якім выпадку спыняецца забеспячэнне бясплатнымі прадуктамі харчавання, напрыклад, ці губляецца такое права, калі дзіця пойдзе ў дзіцячы садок?***

— Афармленне дзіцяці ў дзіцячы садок не паўплывае на працяг атрымання бясплатнага харчавання. У цэлым, бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання спыняецца на падставе інфармацыі, якая прадстаўляецца камісіяй па справах непаўналетніх — у выпадку адабрання дзіцяці з сям'і, органамі апекі і папячыцельства — пры адмове бацькоў ад дзіцяці, адабранні дзіцяці з сям'і, змяшчэнні дзіцяці ў дзіцячую інтэрнатную ўстанову, арганізацыямі аховы здароўя — пры змяшчэнні дзіцяці ва ўстанову аховы здароўя (на тэрмін больш за адзін месяц), смерці дзіцяці, бацькамі — пры змене месца жыхарства дзіцяці (часова або пастаянна), кругласутачным знаходжанні дзіцяці ва ўстанове, якая забяспечвае атрыманне дашкольнай адукацыі, альбо пры наступленні названых абставін.

У выпадку ўтойвання звестак або падачы недакладных звестак, з якімі звязана права на бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання, сям'я пазбаўляецца права на зварот па бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання на працягу шасці месяцаў.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# 64 ПРАБЛЕМЫ ШТОДНЯ



Гэтыя дрэвы 30 гадоў таму дырэктар бачыла зусім маленькімі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Кажа, што ўсе гады работы з дзецьмі стараецца вырашаць тры задачы. Выхаваць малых паўнавартаснымі грамадзянамі краіны, каб ніхто не мог абразіць іх фразай «ты дзетдомавец, што з цябе ўзяць», дамагчыся, каб малыя не паўтарылі памылак сваіх бацькоў, а яшчэ — стварылі ўласныя сем'і.

— Прыходзіш на работу, а там нехта захварэў, камусьці трэба новы дзённік, некаму цыркуль... У нас зараз 64 дзіцяці, і гэта як мінімум 64 праблемы штодня, — дзеліцца дырэктар.

Яна часта ўспамінае словы сваёй аднакурсніцы па філфаку паэткі Яўгеніі Янішчыц, што «чалавек цягам дня пражывае шмат сацыяльных роляў: работніка, пакупніка ў краме, пасажыра ў аўтобусе. І ад таго, наколькі ён сацыялізаваны, залежыць у выніку поспех яго жыцця».



Фаціма — адна з нямногіх дзяцей, чыіх бацькоў няма ў жывых.

— Дзяцей трэба рыхтаваць да гэтых сацыяльных роляў, каб яны разумелі, што ўсё ў жыцці даецца працай, каб ведалі кошт капейцы. А такі «рэстаранны» вобраз жыцця ў дзетдоме, калі ўсё гатовае і па раскладзе, мае адмоўны адбітак. Шкада, што пры такой установе нельга стварыць гаспадарку і грады, — кажа яна.

Валянціна Пятроўна ўпэўнена, што сучасныя дзеці больш разняволеныя, чым іх папярэднікі, знікла наіўнасць, яны хутчэй адаптуюцца да жыцця. Матэрыяльнае забеспячэнне ў іх таксама значна лепшае, чым было раней, і яны не жывуць у закрытай прасторы. Маюць кішэнныя грошы, ходзяць у бібліятэку, кіно і г. д.

### «ПОЛЕ ЦУДАЎ» І «ГАДЗІНА ЧЫТАННЯ»

Пасля абеду дом ажывае, бо дзеці вяртаюцца са школ — вучацца яны ў звычайных установах разам з аднагодкамі, што жывуць з бацькамі.

— Тым не менш станаўленне асобы ў нашых дзяцей значна больш маруднае, чым у хатніх, — заўважае Валянціна Зяневіч. — Мама не прыкладвала іх да грудзей, не фарміравала ўстойлівага псіхалагічнага статусу, і гэта сказваецца і фізічна, і сэнсарна. У іх маруднае ўспрыманне, памяць, увага, лагічнае мысленне.

Тое, што недадалі ў дзяцінстве, трэба навёрстваць, а для гэтага патрэбна добрая эмацыянальная накладка, якую ствараюць праз гульні.

У дзетдоме 13 гурткоў рознага кірунку. Для лепшага засваення школьнай праграмы гуляюць у «Поле цудаў», у клубе «Знатакі» фарміруюць логіку і мысленне, а на занятках у «Таленавітых суразмоўцах» вучацца культуры паводзін і стасункаў.



У дзявочай спальні ўтульна і чыста.

Для фізічнай падрыхтоўкі ёсць «Палёты на спартыўную планету», футбол, эстафеты. А каб навучыцца абслугоўваць сябе, гатуюць у кафэ «Пальчыкі абліжаш» і «Гатуем самі». Малыя атрымліваюць па 10 рублёў на кішэнныя расходы і з гэтых грошай набываюць у краме разам з выхавацелем неабходныя інгрэдыенты. Заадно і вучацца арыентавацца ў цэнах. Нешта прыносяць і самі выхавацелі. Дзеці ўмеюць карыстацца мікрахвалёўкай і пральнай машынкай. Дні нараджэння адзначаюцца як дома, з тортам, свечкамі і падарункам, які заказвае імяніннік. Так што цяперашнія выпускнікі не будуць пакутаваць ад думкі, чаму «макарона цвёрдая». Пасля вячэры штодня наступае «Гадзіна чытання».



Некаторыя дзеці жывуць тут шмат гадоў. Дуся — малодшая з чатырох дзяцей у сваёй матулі — тут нядаўна, але адразу стала любіміцай Валянціны Пятроўны.

### З БАЦЬКАМІ І БЕЗ ІХ

Толькі двое з 64 гадаванцаў дзетдома біялагічныя сіроты, у якіх няма жывых бацькоў. Гэта дзеці, якія нарадзіліся ў Нігерыі. Фаціме ў лістападзе будзе 18, хутчэй за ўсё яна паедзе ў Італію на ўдачарэнне, якое там магчыма да 23 гадоў. Абу — 17, яго, пэўна, возьмуць у дзіцячы дом сямейнага тыпу. У Нігерыі засталася іх старэйшая сястра, якая ўжо сама мае дзетак.

У астатніх дзяцей нехта ёсць, і сваякі, часам, прыходзяць. Вось і цяпер на канапе жанчына чакае Дусю. Дзяўчынка — малодшая з яе чатырох дзяцей, двое з якіх у СПЦ Цэнтральнага раёна, адзін — з бацькам. Усе яны ад розных мужчын.

Большасць малых у дзіцячым доме наведваюць рэдка, аднак дырэкцыя падтрымлівае гэтыя стасункі. Кепскае пра бацькоў тут не гавораць.

— Генетычныя праблемы ў дзетак пачынаюць праяўляцца ў падлеткавым перыядзе, гадоў пасля 14, і тут асабліва трэба працаваць. Лёс сваіх выпускнікоў мы адсочваем яшчэ два гады пасля інтэрната. Тых, хто да нас заходзіць, стараемся і пакарміць, бо ведаем, што з гэтым у іх могуць быць цяжкасці, — кажа Валянціна Пятроўна.

### ІТАЛЬЯНСКАЯ МАМА ЦІ БЕЛАРУСКАЯ ЎТУЛЬНАСЦЬ?

30 дзяцей летам на ўсе тры месяцы паедуць у Італію на аздараўленне. І гэта добра, бо дапамагае дзецям сфарміраваць сямейную пазіцыю, якая павінна існаваць у грамадстве, лічыць дырэктар.

— Якім бы добрым ні быў дзіцячы дом, але гэта дзяржаўная ўстанова са сваімі строгімі законамі і парадкамі, хоць мы і ствараем цёплую абстаноўку.

Дзіцячы дом № 2 месціцца ў пераабсталяваным будынку дзіцячага садка. Тут цяпер шэсць груп: дашкольнікі, дзве групы дзяўчынак і тры групы хлопчыкаў. Падбіраць малых у групы стараюцца па ўзросце.

Сацыяльныя сіроты, пэўна, будуць працягваць з'яўляцца ў Беларусі, аднак няхай яны лепш жывуць з клапатлівымі апекунамі ды прыёмнымі бацькамі, чым з небяспечнымі роднымі ці ў дзіцячых дамах. Тым больш што закрыццё дзетдамоў і накіраванне малых у сем'і ці дамы сямейнага тыпу дапаможа ім у будучым не прывыкнуць спекуляваць ярлыком «бедная сірата», якому ўсё дазволена і ўсе павінны, падкрэслівае дырэктар.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Не патрапіць у «пастку»

# АЛЬФОНСЫ «БЫТАВЫЯ» І ЗАМЕЖНЫЯ

## Іх «работа» — гэта тонкая гульня, скіраваная на ачмурэнне адзінокіх жанчын

**Жанчынам падабаўся малады і прыгожы канадзец. Але на самай справе хлопец разумеў, што няшмат дзяўчат захочуць выйсці за яго. Працаваў ён на падлодцы, рэйсы былі па паўгода і больш. Пакуль мужчына быў малады, гэта яго не турбавала, але чым больш ён сталеў, тым больш хацелася спакойнага жыцця на сушы. Марыў стварыць моцную сям'ю, але ніяк не атрымлівалася: жанчыны не гатовы былі чакаць, пакуль ён звольніцца са службы.**


Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Калі мужчыну было ўжо за сорак, ён вырашыў шукаць жанчыну больш актыўна. Тым больш, што жаніхом ён лічыўся зайздросным: за доўгія гады службы на яго рахунку сабралася даволі прыстойная сума грошай. Самі разумееце, што траціць свой заробак магчымасцяў мелася няшмат. Затое цяпер гэтыя грошы былі даволі добрым стартам для яго будучай сям'і. Але як знайсці нявесту? Вядома, жанчыны славянскага паходжання заўсёды вылучаліся сваёй прывабнасцю, працавітасцю і клопатам. Таму і вырашыў мужчына шукаць у гэтым кірунку. І, нарэшце, яму пашанцавала. Ён знайшоў выдатную жанчыну з Беларусі. Ну і няхай праз сайт знаёмстваў — затое пасля размовы з ёй ён адчуў, што гэта і ёсць тая самая родная душа. У ёй было нешта асаблівае: даверлівасць, сціпласць і незвычайная пяшчота падкупілі жаніха. Пачалі званіць адно аднаму амаль кожны дзень. Пачуцці ўспыхнулі і ўжо не было сіл жыць адно без аднаго. І мужчына вырашыў звольніцца з работы. Здавалася, што гэты апошні рэйс цягнецца невыносна доўга... Нявеста яго пакуль не хацела выязджаць са сваёй краіны, таму канадзец вырашыў пераехаць да яе. Будучая жонка жыла ў сціплай кватэры, яе апартаменты былі малаватыя для дваіх. Тым больш яго грошы дазвалялі маладой сям'і набыць прэстыжнае жыллё ў сталіцы. Але як усё арганізаваць? Мужчына не вельмі давяраў агентам незнаёмай краіны. Даволі доўга абмяркоўвалі з нявестай розныя варыянты. І нарэшце закаханыя прынялі рашэнне: зрабіць усё самім. Як? З дапамогай нявесты. Мужчына пагадзіўся выслаць грошы сваёй каханай. Яе задача была няпростай, але прыемнай — набыць дом для іх будучай сям'і, добраўпарадкаваць яго на свой густ, ну і, канешне, купіць аўтамабіль. Каля пяцісот тысяч долараў пасл
аў мужчына сваёй нявесце на здзяйсненне іх мары. Але нешта пайшло не так. Грошы ён адпраўляў праз афрыканскую краіну, каля якой якраз праплываў. Але там чамусьці вырашылі, што мужчына займаецца кантрабандай, і грошы канфіскавалі. Ён звярнуўся па дакументы ў сваю краіну і здолеў даказаць, што грошы знятыя з яго рахунка. Але нешта людзі ў пагонах пачалі адкрыта патрабаваць у яго хабар. Мужчына быў у адчаі. І тут на дапамогу прыйшла яго нявеста. Жанчына знайшла каля 40 тысяч долараў і выслала свайму жаніху, каб ён здолеў усё наладзіць. І праблема вырашылася: яго грошы накіраваліся далей, у Беларусь. Аб гэтым мужчына радасна паведаміў сваёй нявесце. Засталося толькі дачакацца пераводу і ўсё. Але грошы не дайшлі... Яны зніклі, як, зрэшты, і сам каханы...

НА жаль, падобныя гісторыі здараюцца ў нашай краіне нярэдка.

— Як правіла ахвярамі ашуканцаў становяцца адзінокія жанчыны, — расказвае **часова выконваючы абавязкі намесніка начальніка Савецкага РУУС горада Мінска па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Цімур КЕСЕЛЬ**. — Прычым гэта галоўным чынам жанчыны, якія знаходзяцца ў актыўным пошуку сваёй другой палавінкі і вядуць гэты пошук у сацсетках. Таксама ахвярамі жаніхоў-жулікаў становяцца жанчыны, якія шукаюць для стварэння сям'і забяспечанага мужчыну-іншаземца.

Такія жаніхі звычайна «працуюць» не з адной жанчынай — «каханых» у ашуканцаў адначасова бывае некалькі дзесяткаў. Гэта не значыць, што ўсе яны стануць ахвярамі, але самым даверлівым даклада не пашанцуе.

**Нашы міласэрныя жанчыны гатовыя ўнесці заклад за свайго будучага мужа ўладам любой краіны, даць хабар мытнікам, размытніць неіснуючы аўтамабіль і іншыя дарагія «падарункі» каханага.**

Звычайна ашуканцы падладжваюцца пад кліента. Апісваюць сябе зыходзячы з тых патрабаванняў, якія ўказвае жанчына ў сваёй анкеце. Часу не марнуюць. Ствараюць карцінку сваёй паспяховасці, пасля наладжваюць псіхалагічны кантакт з ахвярай (звычайна мужчыны ў гэтым сэнсе вельмі добра падрыхтаваныя). Падчас зносін з будучай нявестай яны звычайна правяраюць фінансавае становішча жанчыны.

— На самай справе будучыя ахвяры самі пачынаюць расказваць аб сваіх магчымасцях, — гаворыць Цімур Кесель. — Яны дэманструюць на фота дарагія смартфоны, расказваюць аб сваіх падарожжах і нават аб тым, у якой кватэры жывуць.

Нашы міласэрныя жанчыны гатовыя ўнесці заклад за свайго будучага мужа ўладам любой краіны, даць хабар мытнікам, размытніць неіснуючы аўтамабіль і іншыя дарагія «падарункі» каханага.

Як правіла, у міліцыі жанчынам грошы вярнуць не могуць, бо іх мужчыны бясследна знікаюць.

АЛЕ ёсць гора-жаніхі, якія ўсё ж пападаюцца міліцыі. Гэта так званыя нашы, «бытавыя альфонсы». Яны, канешне, «зорак з неба» ад жанчын не патрабуюць. Узнікаюць ярка і прыгожа. Звычайна знаёмяцца з дзяўчатамі «ўжывую». Глядзяць на жанчыну закаханымі вачыма і прыгожа заляцаюцца. Самі заўсёды дагледжаныя, могуць нават прыехаць на дарагой машыне — гэта вельмі ўздзейнічае на маладых дзяўчат. А яшчэ такія маладыя людзі звычайна знаходзяцца ў працэсе «адкрыцця сваёй справы».

Падобная непрыемнасць здарылася з адной мінчанкай, якая звярнулася па дапамогу ў РУУС Савецкага раёна. Яна якраз сустрэла такога маладога чалавека. Пачуцці ўспыхнулі амаль адразу. Праз пару месяцаў жаніх раптам папрасіў жанчыну набыць для яго 10 тэлефонаў, каб раздаць менеджарам свайго новага салона. Канешне, ён абяцаў, што хутка верне грошы. Але ў яго ніяк не атрымлівалася. А потым ён знік. Аказалася, што мужчына — звычайны беспрацоўны, які падмануў не толькі яе.

— Такія хлопцы звычайна не маюць адукацыі, але вельмі камунікабельныя, — гаворыць супрацоўнік міліцыі. — У «бытавых альфонсаў» бывае каля 5-6 жанчын адначасова, і ён можа цягнуць з жанчыны грошы не адзін раз, пакуль «нявеста» яму верыць.

**Ёсць у крыміналістыцы такі раздзел — віктымалогія, — навука, што вывучае працэс «станаўлення» ахвяры. Часта даверлівыя і прастадушныя людзі становяцца ахвярай махляроў, і калі такія эпізоды паўтараюцца, то лепш звярнуцца да псіхолага, які дапаможа знайсці выйсце.**



Ці магчыма засцерагчыся ад такога кахання? У міліцыі паведамілі: так. Калі справа датычыцца міжнародных жаніхоў, ёсць толькі адзін рэцэпт — ніякіх грошай не пералічваць. У выпадку з «бытавымі альфонсамі» трэба проста паназіраць за сваім каханым. Звычайна яны не могуць расплаціцца ў рэстаранах, у іх амаль ніколі няма наяўных грошай, яны не заклапочаны работай, як сапраўдныя бізнесмены, бо іх работа — гэта жанчыны.

ДАРЭЧЫ, з мужчынамі такія «гісторыі кахання» не здараюцца. Затое мужчыны нярэдка становяцца ахвярамі махлярскіх фірмаў. Мужчыны шукаюць спосабы сэканоміць і набываюць манеты-падробкі, неіснуючую мэблю і тэхніку, састаўляюць дагаворы на танны рамонт кватэр з фірмамі-аднадзёнкамі. Нявопытныя аматары порнасайтаў пералічваюць штрафы за наведванне забароненага. Азартныя людзі выйграюць ў інтэрнэт-латарэі і пералічваюць «падаткі» за выдуманыя падарункі. А пажылыя паранейшаму адкрываюць дзверы незнаёмым і набываюць амаль залаты посуд, чароўныя фільтры для вады і пыласосы.

— Да нас звяртаюцца амаль кожны дзень людзі, якія сутыкнуліся з махлярствам, — гаворыць Цімур Кесель. — Асабліва хацелася б папярэдзіць людзей міласэрных, чуллівых. Не давайце незнаёмцам грошы. У нашым аддзяленні ў «бязрукага інваліда» рукі знаходзіліся пад адзеннем, у жанчыны, якая прасіла для хворага дзіцяці ў пераходзе, быў асабісты рахунак, а дзіця чужое. Канешне, быць міласэрнымі добра. Але ж хочацца, каб дапамога і сапраўды знаходзіла тых, хто ў гэтым мае патрэбу.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**



Нататкі шматдзетнага таткі

## КАЛІ Б УСЕ СКАКАЛІ

Вязу трох дачок у школу. Школа знаходзіцца ў глыбіні шматлікіх двароў, і пад'езд да яе вельмі нязручны: з раніцы пастаянныя заторы і адсутнасць паркавачных месцаў. Кожны раз трачу тут ледзь не паўгадзіны толькі на тое, каб заехаць, неяк прыпаркавацца, а потым умудрыцца выехаць (прычым выехаць звычайна цяжэй за ўсё).

Сёння, стоячы ў чарговым заторы, кажу дзецям са злосцю:

— У вашу школу дзяцей трэба з верталётаў на парашутах скідваць.

Старэйшая дачка:

— Было б нядрэнна.

Я:

— Хочацца скокнуць з парашутам?

— Не. Проста, калі б усе скакалі, мы маглі б спакойна да школы пад'язджаць.

А і праўда, было б нядрэнна...

* * *

Пытаюся ў сына пасля першага вучэбнага тыдня:

— Ну і з кім цябе пасадзілі за парту?

— З адной дзяўчынкай.

— Добра, што з дзяўчынкай. (І добра, што з адной.)

— Чаму?

— Ну так бы пасадзілі з якім-небудзь хуліганам.

— Дарэчы, тата, гэта дзяўчынка ўжо шэсць гадоў займаецца тайскім боксам. У яе кожны вечар трэніроўка, а на канікулах зборы.

Ну што я магу сказаць? Цяпер усё залежыць ад сына: калі будзе сябе добра паводзіць, то найбліжэйшыя два гады ён пад надзейнай аховай. А калі дрэнна... Лепш бы з хуліганам пасадзілі.

* * *

Гуляем у парку, далі маладушым дзецям невялікі пакет семак — галубоў пакарміць. Яны пабеглі шукаць галубоў. Хвілін праз дзесяць падыходзім да іх і назіраем наступную карціну: пакет з семкамі амаль поўны, галубы замерлі ў чаканні. А дзеці, не спяшаючыся, чысцяць семкі і кідаюць ім па адной.

Кажам дзецям:

— Вы навошта семкі чысціце?!

— А як яны самі пачысцяць, у іх жа рук няма.

Мне здаецца, такога здзеку з сябе галубы яшчэ не бачылі...

**Павел ХОЛАД.**

Мой досвед

# СУМЯСЦІЦЬ СЯМ'Ю І КАР'ЕРУ

## Мінчанка расказала пра актыўную цяжарнасць і тое, як выйсці на работу адразу пасля родаў

**У тым, што цяжарнасць і жыццё маладой мамы могуць быць актыўнымі, сёння ніхто ўжо не сумняваецца. Толькі ўвасобіць гэта ў жыццё атрымліваецца далёка не ва ўсіх. Трэнер па фітнесе 29-гадовая Марыя Гульбіновіч працавала да самых родаў, а першую пасля нараджэння сына трэніроўку правяла ўсяго праз тыдзень. Маладая мама ўпэўнена, што такая актыўнасць аблегчыла цяжарнасць і дазваляе ў поўнай меры радавацца мацярынству.**



Па першай прафесіі Маша — арганізатар культурных мерапрыемстваў. Пасля заканчэння ўніверсітэта культуры яе размеркавалі ў Свята-Елісавецінскі манастыр.

— Пры манастыры шмат майстэрняў, дзе працуюць людзі, якія трапілі ў неспрыяльную жыццёвую сітуацыю, — такім чынам яны імкнуцца вярнуцца да жыцця. Ці міране, якія жывуць у Мінску, але ім камфортна працаваць у такім месцы. Яны робяць унікальныя рэчы — керамічныя, шкляныя, швейныя вырабы. Мы арганізоўваліся выстаўкі-продажы, у тым ліку і ў розных гарадах Расіі з вялікай культурнай праграмай — атрымліваўся цэлы фестываль. Работа пры манастыры займала ўвесь мой час, бо прыходзілася вельмі шмат ездзіць. І я зразумела, што гэта не зусім тая работа, якой бы я хацела.

Марыя вырашыла змяніць сферу дзейнасці. Яна доўгі час займалася танцамі і яшчэ падчас навучання ва ўніверсітэце вяла групавыя заняткі па бодзі-балету.

— Гэта было маё хобі падчас вучобы — праграма, па якой рыхтуюць балерын, але адаптаваная для звычайнага чалавека з больш простымі практыкаваннямі, якія кожнаму пад сілу. Пазней я скончыла курсы ва ўніверсітэце фізічнай культуры — гэта маё першае навучанне на інструктара па фітнесе. Адкрыла сваю студыю і пачала працаваць.

Студыя «Мэры-фітнес» праіснавала два гады. Маша сама праводзіла трэніроўкі і займалася ўсімі арганізацыйнымі справамі. Калі вырашыла засяродзіцца толькі на трэніровачным працэсе, студыю прыйшлося закрыць.

— Я пастаянна вучылася. Пасля фітнесу вывучыла пілатэс, работу са скаліёзамі, грыжамі, дыястазам, з цяжарнымі жанчынамі і па аднаўленні пасля родаў. Спачатку ты бачыш агульны малюнак, пасля пачынаеш паглыбляцца ў цела. Зараз я трэнер па пілатэсе, а таксама метадыст па пілатэсе ў школе фітнесу — выкладаю для трэнераў. Плюс маю асабістую практыку для людзей, якія хочуць працаваць з целам глыбока: разумець, чаму штосьці баліць, як жыць без напружання, як рухацца ў радасць. Я дапамагаю дасягаць лепшых вынікаў, калі чалавек, напрыклад, катаецца на лыжах ці займаецца сёрфінгам, а таксама адаптаваць цела пасля родаў.

Сваё жыццё пасля наступлення цяжарнасці Марыя змяніла нязначна. Работа, а разам з ёй і фізічныя нагрузкі прысутнічалі да самых родаў. Да сёмага месяца цяжарнасці яна вяла некалькі груп па пілатэсе, а таксама персанальныя трэніроўкі. Паспела правесці і два навучальныя курсы па пілатэсе для трэнераў.

— Я не магу сказаць, што мая цяжарнасць праходзіла лёгка: першыя 4—5 месяцаў быў моцны таксікоз. Работа стала аддушынай, дзе я пераключалася і вяла заняткі. Так, у мяне быў выбар: застацца дома і ляжаць увесь дзень ці пайсці на работу. Усім кіруе наш мозг: калі я пераключалася, то лепш сябе адчувала ў параўнанні з тым, калі б я канцэнтравалася на сваім стане. А на шостым месяцы таксікоз адпусціў. Я сябе выдатна адчувала! У моманты, калі хацелася паляжаць, вельмі важная матывацыя: я ведала, што прыйду на работу і атрымаю нашмат больш, чым патрачу. Удзячныя людзі, вынік, які я бачу ў працэсе трэніровак, вельмі натхняюць. Я адчувала сябе патрэбнай у зале.

Правільна падабраныя фізічныя практыкаванні для цяжарных вельмі карысныя, упэўнена Марыя. І яе ўласны вопыт гэта пацвярджае.

— Фізічная нагрузка ў мяне была кожны дзень, але я выконвала толькі тыя практыкаванні, якія карысныя для цяжарных, астатнія тлумачыла. Існуюць прапрацаваныя праграмы, якія аблягчаюць цяжарнасць: папярэджваюць і пазбаўляюць ад болю ў паясніцы, у шыі. Кожная жанчына індывідуальная, і ў яе могуць быць супрацьпаказанні да нейкіх практыкаванняў. У залежнасці ад тэрміну цяжарнасці нагрузкі мяняюцца. І чым больш дасканалая праграма, якую жанчына выконвае, тым лягчэйшыя і цяжарнасць, і самі роды. Выхадныя, калі я менш рухалася, для мяне былі больш цяжкія.

Працавала Маша да самых родаў.

— Я прыйшла дадому з навучальнага семінара па дыханні, а праз тры гадзіны мы з мужам пайшлі ў раддом. На семінары яшчэ жартавалі, што зараз надыхаешся і народзіш. Так і атрымалася.

Марыя прапанавала мужу партнёрскія роды, і ён падтрымаў ідэю. Будучыя бацькі прайшлі адпаведныя курсы.

— Муж умее мяне супакоіць, прыструніць нават, — усміхаецца яна. — Таму я спытала, ці камфортна яму будзе, калі ён пойдзе са мной на роды. Іван пагадзіўся. Як для спецыяліста па руху, мне было цікава, ці змагу я справіцца з дыханнем, з болем. Усё, чаму вучаць перад родамі, працуе: важна і тое, як ты настроішся, як кіруеш целам.

Сёння маленькаму Раману тры месяцы. Маладая мама выйшла на работу праз тыдзень пасля яго нараджэння. Спачатку яна працавала гадзіну ў дзень, пасля — дзве, зараз ужо чатыры. З чэрвеня, акрамя персанальных трэніровак, яна выкладае і на трэнерскіх курсах.

— Для мяне вельмі важная работа, і я зразумела, што калі цалкам сяду ў мацярынства, будзе вельмі цяжка. Праўда, калі нарадзіўся малы, адчула, што гэта новы, зусім іншы стан. Гэта штосьці неверагоднае! І мне трэба было знайсці кампраміс. Варыянт, які раіць вядомы псіхолаг Людміла Петраноўская, мне падышоў. Калі ты з дзіцем, ты з ім на 100 %. Але ў той жа час малы можа пабыць і з іншым дарослым, з якім яму камфортна. Тата гэтак жа памяняе падгузак, пакорміць малаком, якое я пакідаю. Калі ў дзіцяці бацькі жывыя, то яму балюча і са мной. А каб напаўняцца рэсурсам, мне неабходна хадзіць на маю любімую работу — хоць бы на гадзіну ці дзве. Я вяртаюся, вельмі сумуючы па ім. Добра, калі будні з малым не ператвараюцца ў руціну. Дзіця — гэта вялікае шчасце, і калі я пакідаю яго на нейкі час, то ўсведамляю, якое гэта шчасце.

Маша ўдзячная мужу за падтрымку і магчымасць працаваць. Яго рабочы расклад дазваляе маладой маме рэгуляваць сваю занятасць. Увогуле, сёння час маладыя бацькі плануюць на кожны тыдзень.

— Сёння свет вельмі хуткі, і жанчыне амаль немагчыма не працаваць, — упэўнена Марыя. — Актыўная цяжарнасць і работа палегчылі мой стан, у тым ліку і эмацыянальны. Я адчувала сябе ў соцыуме, працягвала кантактаваць з людзьмі.

На тое, як не стамляцца ад вялікай колькасці абавязкаў, у маладой мамы таксама ёсць свой погляд.

— Мая кліентка аднойчы сказала: «Маша, калі будзе здавацца, што выбіваешся з сіл, успомні, што раней не было памперсаў, пральных машын, пыласосаў — і нашы мамы былі шчаслівыя!» А тое, чаму я вучу наведвальнікаў у зале, дае дадатковыя рэсурсы. Я паказваю людзям, як быць больш энергічнымі. І ад гэтых заняткаў сама атрымліваю энергію.









Добрыя справы

# Дзеці не перастаюць марыць

## Пра гэта памятае Беларускі дзіцячы хоспіс і спраўджвае іх жаданні

**Праект «Казка дзецям» дорыць падапечным Беларускага дзіцячага хоспіса чароўнае падарожжа, магчымасць упершыню паляцець на самалёце, пабываць за мяжой і спраўдзіць запаветныя жаданні. У канцы мая дзеці з цяжкімі захворваннямі пабывалі ў Санкт-Пецярбургу.**

За час існавання праекта падапечныя дзіцячага хоспіса наведалі Будапешт і Маскву, пабывалі ў Літве. Гэтым разам група з 11 чалавек, якая складалася з пяці дзяцей на калясках, пяці бацькоў і сацыяльнага работніка хоспіса Андрэя Гапановіча, накіравалася ў паўночную сталіцу суседняй краіны.

Дзеці пабывалі ў Батанічным садзе, дзяржаўным музеі «Эрмітаж», Пецяргофе і Петрапаўлаўскай крэпасці. А таксама ўрачыста адзначылі дзень нараджэння аднаго з удзельнікаў падарожжа.

Кожны раз дзіцячы хоспіс імкнецца падарыць сапраўдную казку дзецям і бацькам падчас падарожжа і арганізаваць яго на самым высокім узроўні. «Калі дзіця хворае, яно не перастае марыць» — пад такім дэвізам тут рэалізуюць жаданні.

Гэтым разам група спынілася ў атэлі «Рэгіна» — у нумарах, спецыяльна абсталяваных для людзей з інваліднасцю. У арганізацыі экскурсійнай праграмы дзіцячаму хоспісу дапамог Міжнародны клуб Lions Club Sankt-Petersburg. Паездка стала магчымай дзякуючы фінансавай падтрымцы Тату-клуба «Олд Візард» і тэатра-студыі танца «СамаЯ». Авіяпералёт дапамагла ажыццявіць кампанія «Белавія».

Беларускі дзіцячы хоспіс — недзяржаўная некамерцыйная структура. Яна аказвае медыцынскую, псіхалагічную, сацыяльную і духоўную дапамогу сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей з захворваннямі, што абмяжоўваюць тэрмін жыцця і пагражаюць яму. Пацыенты хоспіса — дзеці і маладыя людзі ва ўзросце да 24 гадоў. Пад апекай арганізацыі знаходзіцца ад 150 да 250 сем'яў, якія жывуць не толькі ў Мінску, але і ў радыусе 250 кіламетраў ад сталіцы.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# МАЛЕНЬКІМІ НОЖКАМІ НА ВЯЛІКІЯ ПОДЫУМЫ




### «Сярод дзяцей з усяго свету Міша аказаўся адзіным беларусам»

Мы сустракаемся на адным з мінскіх стадыёнаў, у шчыльным графіку хлопчыкаў складана знайсці вольную гадзіну. У Яфіма вось-вось пачнецца трэніроўка, Міша прыйшоў на стадыён за кампанію з братам. Мама двайнят Марыя відавочна хвалюецца, кажа, што для хлопцаў гэта першае інтэрв'ю, таму ёй самой цікава, як яны будуць сябе паводзіць падчас яго. А вось самі браты ў выдатным настроі і ўжо рвуцца ў размову.

Цяпер Яфіму і Міхаілу дзевяць гадоў, здымацца ў кіно хлопцы пачалі пяць гадоў таму. Тады Марыя ўбачыла інфармацыю, што ў адзін з фільмаў патрабуюцца дзяўчынкі-блізняткі, але ўсё роўна вырашыла паспрабаваць. «Мне самой заўсёды вельмі падабалася кіно. Спрабавала здымацца ў эпізодах і масоўках, потым усё гэта пераключылася на дзяцей, — расказвае яна. — У лісце на кастынг напісала, што калі не атрымаецца знайсці дзяўчынак, то ёсць хлопчыкі. Праз нейкі час нас папрасілі прыйсці на тыя пробы, і мае дзеці падышлі». Так, дэбютам братоў Цубаў у кіно стаў фільм «Фарца».

Неўзабаве ў сферы іх інтарэсаў з'явіўся і мадэльны бізнес. «У Мішы былі праблемы з нагамі: ён касалапіў, таму я вырашыла аддаць дзяцей у мадэльнае агенцтва, доўга шукала школу, выбірала, — дзеліцца мама хлопчыкаў. — Адна са школ не спадабалася дзецям, а я прыхільнік таго, што калі ім не падабаецца, то хадзіць туды не варта».

Так атрымалася, што мадэльная школа не толькі дапамагла паправіць паходку, але і «перарасла» ў нешта большае. Летась Мішу Цубу запрасілі папрацаваць у Італіі, там ён рэкламаваў вядомую марку адзення Dsquared. Сярод 15 дзяцей з усяго свету Міша аказаўся адзіным беларусам. А нядаўна сям'я вярнулася з Кітая: хлопцы з мамай знаходзіліся там два месяцы, увесь гэты час у іх былі здымкі ў розных праектах.

«Я вельмі доўга думала, ці варта туды ехаць, — расказвае Марыя. — Сур'ёзна размаўляла з дзецьмі, не хавала ад іх таго, што яны едуць у Кітай працаваць, што гэта не адпачынак, што, магчыма, будзе складана. Толькі пасля таго як яны абдумалі і я дзесяць разоў усё ўзважыла, мы рызыкнулі».

— А мы доўга не разважалі, — уключаецца ў размову Міша. — Бо ў Італію лётаў толькі я, а мама і Яфім ні разу не лёталі на самалёце. Ім трэба было гэта паспрабаваць, прытым у мамы якраз быў дзень нараджэння, атрымліваецца, мы падарылі ёй гэтую паездку.

### «Аб няўдалых кастынгах стараюся не нагадваць»

Яфім адзначае, што працаваць у Кітаі было складана, бо часам здымацца даводзілася цэлы дзень, часта без выхадных. «Але мне ўсё роўна спадабалася, — кажа хлопчык. — У некаторыя дні ўсё ж такі атрымлівалася адпачываць, мы пабывалі ў парках і заапарку».



У Мішы работы было менш. «У Кітаі запатрабаваны пэўны рост, — тлумачыць Марыя. — Міша яго ўжо трохі перарос».

Самыя вялікія складанасці, з якімі даводзіцца сутыкацца хлопчыкам на здымках, — гэта доўгія рабочыя змены і чаканне, у гэтым выпадку ратуюць цацкі і тэлефоны. Яшчэ адзін складаны момант для дзяцей — кастынгі, дакладней іх вынікі. «Калі хлопцы не праходзяць адбор на якую-небудзь ролю ці праект, моцна не хвалююцца, слёз з-за гэтага дакладна не было ніколі, — прызнаецца Марыя. — Але ўсё роўна аб няўдалых кастынгах я стараюся ім не нагадваць».

Арганізацыйнымі пытаннямі хлопцаў займаецца мама, яна ж дапамагае ім вучыць тэксты сцэнарыяў, аднак у той жа час Марыя сур'ёзна сочыць за графікам дзяцей, каб расклад сыноў быў не перагружаны. «Я лічу, што ў першую чаргу ў дзяцей павінны быць адэкватныя бацькі, — кажа яна. — Людзі павінны разумець, ці трэба той ці іншы занятак дзіцяці, ці можа дзіця гэтым займацца, ці хоча яно. Я бачу сітуацыі, калі нашмат больш гэтага хочуць бацькі і думаюць, што іх дзеці ўжо зоркі, але толку ад такіх заняткаў мала. Не скажу, што я не ганаруся сваімі хлопчыкамі, безумоўна, мне прыемна, калі кажуць аб іх поспехах. Але ж яны самі хочуць гэтым займацца! Напрыклад, у нас абодва сыны спрабавалі сябе ў футболе, але Мішу не падабаецца гуляць, а Яфіма з нараджэння цягне да мяча. Я не стала нікога прымушаць, адзін застаўся ў футболе, другі ў якасці спорту абраў для сябе фехтаванне».

Самі хлопцы сцвярджаюць, што для іх складанасцяў са здымкамі не існуе наогул, яны не саромеюцца грымёраў і фатографаў, дарослых партнёраў па кінапляцоўцы і рэжысёраў. «Калі нашы дарослыя калегі добрыя, то мы добра ладзім, а калі сварацца з намі, то даводзіцца складана», — усміхаецца Яфім.

Хлопцы, нягледзячы на свой узрост, працуюць, як і дарослыя, па кантрактах, за якія атрымліваюць грошы. Марыя прызнаецца, што ў Беларусі яны, вядома, невялікія, хоць працуюць дзеці нараўне з дарослымі. «Вядома, у першую чаргу я прымаю рашэнне, ці пойдзе ў той ці іншы праект дзіця, але за грашыма мы не гонімся. Калі праект цікавы, пагаджаемся без пытанняў». Напрыклад, зараз Яфім здымаецца ў фільме пра Янку Купалу, дзе іграе маленькага паэта.

— Мне вельмі падабаецца гэтая роля, — расказвае хлопчык. — Па сюжэце бацька забараняе мне вучыцца, таму што сам усё жыццё быў працаўніком, а я вельмі гэтага хачу. Але пазней ён усё ж адпраўляе мяне ў школу і нават дорыць кнігу. Мой герой па-вар'яцку шчаслівы, — прыгадвае самую запамінальную сцэну Яфім.

Плануецца, што беларускі фільм пра вядомага паэта выйдзе на вялікія экраны ўжо ў другой палове 2019 года.

### «У школе мы вядомыя»

Сёння на рахунку хлопчыкаў ужо ёсць нядрэнны вопыт, здымкі ў такіх серыялах, як «Колер саспелай вішні», «Мы ўсё роўна будзем разам», «Чорная кроў», «Смешнае каханне». Марыя ўсяляк спыняе нават найменшыя намёкі сыноў на зорнасць, хоць Міша расказвае, што ў школе іх з братам практычна ўсе пазнаюць. «Некаторыя падыходзяць адразу пасля выхаду фільмаў, кажуць пра тое, што бачылі нас у тэлевізары». «Так, у школе мы вядомыя», — дадае Яфім. А Марыя кажа, што просіць сыноў не афішаваць свае дасягненні. «Яны яшчэ не зоркі, так, штосьці ў іх атрымліваецца, але яны яшчэ маленькія, хлопчыкам вучыцца і вучыцца. Кожны раз пра гэта ім кажу».

У кіно Міша і Яфім запатрабаваныя больш па адным, а не ў якасці братоў, хлопцы нават адзначаюць, што паміж імі ёсць здаровая канкурэнцыя, але пры гэтым яны ўсё роўна сябруюць. «Аднойчы адбылася такая гісторыя: Яфім збіраўся на кастынг спрабавацца на ролю, а мне не было з кім застацца дома, таму мама ўзяла і мяне, — расказвае Міша. — Яфім прачытаў тэкст, але ў яго адбыўся такі «касяк» — ён перайграў. Пра гэта яму сказаў рэжысёр. Тады паспрабавацца на ролю вырашыў я — і атрымалася».

Міша ўжо ўпэўнены ў сваёй будучыні. «Я ведаю: я прафесійны акцёр, і буду ім, калі стану дарослым, ніколі не здраджу кіно». Мама хлопцаў здзіўлена кажа, што нават для яе гэта адкрыццё. Яфім таксама не хавае здзіўлення, бо пакуль менавіта ў яго больш акцёрскіх работ. «Я думаю, як вырасту, калі не атрымаецца з мадэльнай і акцёрскай справай, пайсці ў футбалісты, калі не атрымаецца з футболам, буду фехтавальшчыкам, карацей, падумаю, кім быць», — губляецца Яфім. І дадае, што наогул марыць сыграць ролю касманаўта. Марыя ў сваю чаргу адзначае, што галоўнае, чаго б ёй хацелася, — вырасціць з хлопцаў добрых людзей, а калі праз год яны скажуць, што не жадаюць больш хадзіць па подыуме і здымацца ў кіно, яна трохі засумуе (усё ж такі выдаткавана вельмі шмат сіл, у тым ліку дзеля хлопчыкаў жанчына кінула сваю работу), але прыме выбар сыноў.

Мама маленькіх акцёраў кажа, што часцей за ўсё сустракаецца з пазітыўнай ацэнкай таго, што сыны выбралі публічныя заняткі ў юным узросце. «Нават наш тата ў самым пачатку быў вельмі супраць, а потым убачыў, што ў дзяцей атрымліваецца, што ім гэта падабаецца, і прызвычаіўся, — расказвае Марыя. — Бабулі, дзядулі таксама падтрымліваюць унукаў, ганарацца імі і замілоўваюцца, калі бачаць іх на экранах». «Вядома, яны ж любяць серыялы», — дадае Міша.

Напрыканцы Марыя адзначае, што ў акцёрскай і мадэльнай мітусні хлопцы не забываюць пра вучобу, разумеюць, што яна ім вельмі патрэбна. Нават знаходзячыся ў Кітаі, браты штодня выходзілі на сувязь з настаўніцай, каб не адставаць ад школьнай праграмы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**Фота з асабістага архіва сям'і.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



З нашай пошты

## ДРУГАЯ МАМА

**У кнігах па выхаванні часта пішуць: дзецям не трэба казаць, як сябе паводзіць, ім трэба паказваць. Адзін з такіх прыкладаў — учынак вельмі сціплага і інтэлігентнага чалавека: жанчына ўзяла на выхаванне сяброўку сваёй дачкі, якая засталася без мамы.**



Вольга Аляксандраўна Кудрэвіч працуе ў Мінскім дзяржаўным турыстычна-экалагічным цэнтры дзяцей і моладзі загадчыкам метадычнага кабінета. Дзяўчынку завуць Аліна. Дакументы на афармленне статусу прыёмнай дачкі Вольга Аляксандраўна не падавала — проста не бачыла ў гэтым сэнсу. За дзяўчынкай яна прыглядвала яшчэ тады, калі ў яе мама цяжка хварэла. Калі ў яе пачаліся моцныя болі (анкалогія), Аліне ў такой абстаноўцы рыхтавацца да выпускных экзаменаў было складана, таму Вольга Аляксандраўна забірала дзяўчынку да сябе дадому — яе дачка Марыя і Аліна сябравалі. Хворую жанчыну дагладаў тады бацька Аліны. У красавіку 2016 года Алінінай мамы не стала, бацька прыахвоціўся да спіртнога. Пахаванне арганізоўвалі Вольга Аляксандраўна, яе дачка Марыя і сама Аліна, бо на момант смерці не мелася ні капейкі ў доме.

— Гэта была жудасная гісторыя, спакойна не магу ўспамінаць, — кажа Вольга Кудрэвіч. — Яшчэ больш згуртаваліся мае дзяўчынкі і зараз увесь час праводзяць разам, нават вучацца ў адным каледжы (Мінскі гандлёвы каледж — філіял БДЭУ. — **Аўт.**). Праўда, дачка вучыцца на бюджэце, а Аліна на платным аддзяленні — усяго аднаго бала не хапіла. Вельмі складана было з аплатай, але свет не без добрых людзей: сёлета дапамагалі бацькі навучэнцаў групы, сабралі патрэбную суму. Яшчэ было вельмі шмат праблем з ЖКГ, вялізныя запазычанасці за святло, ваду ды і саму кватэру. І гэтыя пытанні мы вырашылі.

Дзяўчаты лічаць сябе сёстрамі, а прыёмная дачка называе Вольгу Аляксандраўну мамай. Усе нягоды і радасці дзеляць яны адзін з адным без утойвання. Зараз дзяўчыне 18 гадоў. Па словах «другой мамы», Аліна добрая, выхаваная, гаспадарлівая, вельмі актыўная і цікаўная.

Цяпер многія людзі, перш чым нешта зрабіць, пралічваюць, што яны атрымаюць ад сваіх дзеянняў, і калі гэта не выгадна, нават брацца не будуць. Вольга Аляксандраўна не лічыла сваіх магчымых выдаткаў, а зрабіла так, як падказала ёй сэрца. Ці не гэта жывы прыклад для кожнага з нас? Падумайце, каму вы можаце быць карыснымі і патрэбнымі, і станьце такім чалавекам!

**Кацярына МАТУСЕВІЧ.**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: ИП «Икартайм» Р. Исаян (УНП 101295853) в лице антикризисного управляющего ИП Лужинского А. И.

Четвертые повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 июня 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 17.04.2019 г.

| Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|
| Каплеструйный бесконтактный маркиратор | 1 320,00 |
| Каплеструйный принтер | 1 320,00 |
| Машина упаковочная ВТН-41 | 1 710,00 |
| Мельница | 2 460,00 |
| Мельница | 2 460,00 |
| Полуавтомат фасовочно-упаковочный У01 | 810,00 |
| Полуавтомат фасовочно-упаковочный У01 | 810,00 |

Местонахождение предметов торгов – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 04.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 20.06.2019 г. 17.00** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: ОАО «Агрокомбинат «Приднепровский» (УНП 700018291) в лице антикризисного управляющего Волчка В. И.

Четвертые повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **24 июня 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 06.04.2019 г.

| **№ п/п** | **Предмет торгов** | **Начальная цена, бел. руб. с НДС** |
|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой специальный цистерна ZIL-130, 1988 г. в., кузов № 2748810 | 2 080,00 |
| 2 | Трактор «Беларус-892», 1999 г. в., зав. №08019479 | 5 000,00 |
| 3 | Комбайн зерноуборочный самоходный КЗС-1218-10 «ПАЛЕССЕ», 2008 г. в., гос. № ТВ-6 3072 | 11 715,00 |
| 4 | Экскаватор ЭО2621, 1984 г. в., гос. № 8705 МД | 2 100,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. № 700/С-103892, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24/2. здание инв. № 814, севернее аг. Романовичи, площадь – 1255,0 кв. м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель;<br>Капитальное строение с инв. № 700/С-103894, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24. здание инв. № 683, севернее аг. Романовичи, площадь – 924,1 кв. м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель;<br>Капитальное строение с инв. № 700/С-103893, Могилевский р-н, Кадинский с/с, 24/1. здание инв. № 684, севернее аг. Романовичи, площадь – 1031,0 кв. м, назначение – здание специализированное животноводства, включая мебель | 70 000,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. №700/С-104270, Могилевский р-н, Р-122, 15-й км, 1, площадь – 2361,2 кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – Страусиное ранчо, емкость 38 куб. м (закопана на страус. ранчо под канализацию), 1 шт., 2009 г. в., инв. № 2677 | 127 440,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698 53 03, Игорь.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 21.06.2019 г. до 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация»; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте WWW.BELTORGI.BY).

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Результаты торгов оформляются в виде протокола.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 10.07.2019 г. АУКЦИОНОВ

| Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Местонахождение земельного участка | Дополнительные сведения | Вид права | Дата и время проведения | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на проведение аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 324350100001001221 | 0,1297 | Гомельская область, город Петриков, улица Луговая, 51 | Возможность подключения электро -газо -водоснабжения,<br>имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением:<br>– в санитарно-защитных полосах водоводов на площади 0,0622 га;<br>– в охранной зоне объектов газораспределительной системы на площади 0,0041 га (в связи с изменениями при строительстве уличного распределительного газопровода по улице Луговая в г. Петриков, необходимо выполнить перенос границ земельного участка по ул. Луговая, 51 на 1,2 метра, или выполнить вынос газопровода за свой счет) | Аренда сроком на 99 лет | 10.07.2019 14.00 | 2 133,57 | 213,00 | 1513,42 |
| Для строительства и обслуживания бесконтактной мойки автомобилей | 324350100001001256 | 0,0778 | Гомельская область, город Петриков, улица Бумажкова | Возможность подключения электро -водо -газо -снабжения | Аренда сроком на 99 лет | 10.07.2019 15.00 | 3135,34 | 314,00 | 1970,64 |
| Для строительства и обслуживания торгово-социального объекта | 324384801601000258 | 0,0690 | Гомельская область, Петриковский район, деревня Мышанка | Возможность подключения электро -водо -снабжения | Аренда сроком на 99 лет | 10.07.2019 16.00 | 569,25 | 57,00 | 2109,56 |

| | |
|---|---|
| Р/с для перечисления задатка | Р/счет Петриковского районного исполнительного комитета BY03 AKBB 364 14260002413300000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21317, УНП 400065489 |
| Условия проведения аукциона | Шаг аукционов определен в размере 15 % от предыдущей объявленной цены. Первая объявленная цена определяется в соответствии с шагом аукциона к начальной цене предмета аукциона |
| Сроки приема заявлений, адрес, контактный телефон | С 9 июня 2019 года по 9 июля 2019 года с 9.00 до 17.00, г. Петриков, ул. Гагарина, 17.<br>Отдел землеустройства Петриковского райисполкома, (здание ГЛХУ «Петриковский лесхоз», 3-й этаж, тел. + 375 (29) 3432199 – Велком |
